Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 САКАВІКА 2016 г. СУБОТА № 56 (28166) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СВЯТЛО І РАДАСЦЬ ВЕРЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінская студэнтка Юлія ШУНЬКО каля касцёла Святых Сымона і Алены.

ЧАС ШЧЫРАЙ МАЛІТВЫ

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 27 сакавіка 2016 года

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Вялікаднем.

Вясенняе абуджэнне прыроды нагадвае нам аб вялікай падзеі для кожнага хрысціяніна — ва ўсе часы Уваскрэсенне Хрыстова з'яўляецца сімвалам надзеі і веры.

Велікодныя дні напоўнены ўрачыстасцю і святлом хрысціянскай любові. Вялікае свята зноў заклікае задумацца над сэнсам жыцця, усвядоміць высокае прызначэнне чалавека. Гэта час шчырай малітвы, добрых учынкаў і міласэрных спраў.

Няхай радасць Уваскрэсення спадарожнічае кожнаму верніку ў справе духоўнага ўдасканалення, садзейнічае творчым здабыткам, усебакова абнаўляе наша жыццё ў імя высокіх ідэалаў.

Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, цеплыні сямейнага ачага, міру і згоды, поспехаў у працоўнай дзейнасці.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Падлеткі Вялікай Айчыннай

СТАР. 13

Духоўная музыка нарадзілася ў Гомелі

СТАР. 18

ЛІЧБА ДНЯ

Амаль 1,8 тыс.

трансплантацый праведзена за пяць гадоў у нашай краіне: 305 трансплантацый печані (з іх 2 — комплексу «печань-нырка»), 160 трансплантацый сэрца, 1 тыс. 305 трансплантацый ныркі, 12 трансплантацый комплексу «нырка-падстраўнікавая залоза», 2 трансплантацыі лёгкіх. За гады рэалізацыі нацыянальнай праграмы значна павялічаны аб'ёмы і палепшана даступнасць кардыялагічнай і высокатэхналагічнай кардыяхірургічнай дапамогі насельніцтву. Штогод у кардыялагічных аддзяленнях атрымліваюць меддапамогу больш за 190 тысяч пацыентаў.

ISSN 1990 - 763X

ХРЫСТУС УВАСКРОС, І ЁН З НАМІ

Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Вялікдзень

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры, усе людзі добрай волі!

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос!

Сёння мы з радасцю вітаем адзін аднаго гэтым пасхальным прывітаннем, бо Уваскрэсенне Хрыста з'яўляецца падмуркам нашай веры і гарантыяй вечнага жыцця. Менавіта таму пасхальная радасць распірае нашы сэрцы, і мы дзелімся ёю з іншымі.

Евангелле распавядае нам, як жанчыны-міраносіцы накіраваліся да магілы Езуса, каб аддаць Яму апошнюю паслугу і паводле яўрэйскага звычаю намасціць Яго цела пахучымі алеямі. Яны былі занепакоены тым, хто адсуне камень, якім быў загароджаны ўваход у магілу, якую сцераглі вартаўнікі. Якое ж здзіўленне ахапіла іх, калі яны ўбачылі магілу адкрытай. Яшчэ большае здзіўленне выклікаў у іх той факт, што ў ёй не было цела Езуса, а анёлы, якія там знаходзіліся, ім сказалі: «Чаму вы шукаеце жывога сярод мёртвых? Яго тут няма; Ён уваскрос» (Лк. 24, 5).

СТАР. 6

■ Круглы стол

ШКОЛЬНАЯ АДЗНАКА: ПЕРНІК ЦІ БІЗУН?

Ці гатовы настаўнік падзяліцца на ўроку сваёй уладай

Вядомы прадстаўнік гуманнай педагогікі Шалва Аманашвілі, які наведаў летась Мінск і сустрэўся як з вопытнымі настаўнікамі, так і з будучымі педагогамі, студэнтамі БДПУ, на адной з такіх сустрэч параўнаў школьную адзнаку з «вінтоўкай, нацэленай у лоб дзіцяці». Уладальніца звання «Лепшы настаўнік свету 2015 года» Нэнсі Этвел прызнаецца, што не верыць у адзнакі. Яны, на яе, думку, бессэнсоўныя, таму што не могуць паказаць рэальны ўзровень паспяховасці дзіцяці. Але, на жаль, школьная адзнака застаецца неад'емным атрыбутам нашай сістэмы адукацыі. Што звычайна жадаюць школьніку? Добрых адзнак...

Між іншым, у Беларусі пашыраецца кола педагогаў, якія прапагандуюць актыўную ацэнку.

Каб даведацца больш пра новую стратэгію ў навучанні, мы запрасілі да ўдзелу ў дыскусіі аўтараў дапаможніка «Актыўная ацэнка ў дзеянні: вопыт настаўнікаў Беларусі» прафесара кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдата педагагічных навук, дацэнта Мікалая ЗАПРУДСКАГА, начальніка Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі АПА Алену РАДЗЕВІЧ, метадыста аддзела метадычнага забеспячэння гісторыка-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Алену ПАЛЕЙКА, кіраўніка партала nastaunik.info, намесніка старшыні Таварыства беларускай школы Тамару МАЦКЕВІЧ, старшага выкладчыка кафедры педагогікі факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій БДПУ Міхаіла КУДЗЕЙКУ, а таксама настаўніцу пачатковых класаў сярэдняй школы №17 горада Барысава Святлану ЛОКІС і маці пяцікласніцы адной са сталічных школ Святлану ПАЛЯНСКУЮ.

СТАР. 4-5

ЧАС РАШАЦЬ ПРАБЛЕМУ

На наступным тыдні Прэзідэнт мае намер падпісаць дакумент аб удасканаленні пенсійнай сістэмы

Вырашэнне пытання ўдасканалення пенсійнай сістэмы нельга зводзіць толькі да пенсійнага ўзросту. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе, прысвечанай абмеркаванню гэтай тэмы.

«Гэта важнае пытанне, яно сёння на слыху, але гэта не ўся пенсійная сістэма. Акрамя пенсійнага ўзросту, як мінімум ёсць яшчэ праблема ўдасканалення самой пенсійнай сістэмы, гэта значыць фарміравання пенсійнага фонду і, скажам прама, у выніку — памеру пенсіі», — сказаў кіраўнік дзяржавы, падкрэсліўшы, што рашэнне гэтага пытання ўжо наспела. «Па меры назапашвання праблем, з'яўлення новых, пытанняў, якія трэба вырашаць, якія паўстаюць востра, — іх трэба вырашаць, у спакойным рэжыме, размаўляючы з людзьмі, пераконваючы наша грамадства ў тым, што гэта трэба рабіць», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што так паступілі з вырашэннем пытання па камунальных паслугах, знайшоўшы кампрамісны варыянт з грамадствам. «Што тычыцца пенсійнай сістэмы, якой ёй быць: салідарнай, размеркавальнай ці назапашвальнай. Людзі прынялі таксама нашу прапанову, што сыходзіць ад гэтага не трэба, павінна быць салідарная, размеркавальная сістэма пенсій, як у нас зараз, і на добраахвотнай аснове назапашвальная сістэма, што ў нас не забаронена і заканадаўча вызначана», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Што тычыцца пазіцыі нашага грамадства, я вельмі ўважліва назіраю за абмеркаваннямі, развагамі людзей. Мы вельмі акуратна вымяраем настрой грамадства. Павінен сказаць, што сёння ўжо цвёрдая большасць нашага насельніцтва згодныя з павышэннем пенсійнага ўзросту. Я не кажу пра тое, падабаецца камусьці ці не падабаецца. Нават тыя, каму гэта не падабаецца, нарэшце, зразумелі, што рана ці позна мы гэтую праблему павінны вырашаць. І час вырашэння праблемы прыйшоў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў цяперашнім пенсіянерам, якія раней былі супраць падобных крокаў, а цяпер пагадзіліся. «Калі людзям патлумачылі, у чым сутнасць і як мы маем намер дзейнічаць, у прынцыпе і пенсіянеры — тыя, каго, зрэшты, не датычыць гэтае пытанне, — прынялі нашу пазіцыю. Таму сёння сітуацыя ў грамадстве больш-менш нармальная, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Моладзь наша — ну проста малайцы! Разумеючы, што гэта закране іх перш за ўсё і тых, хто працуе, тым не менш, спакойна ўспрынялі гэтыя прапановы».

«Людзі разумеюць, што сёння колькасць пенсіянераў пры такім пенсійным узросце, як у нас, расце значна большымі тэмпамі, чым застаецца працуючых людзей. Гэта значыць людзі, якія працуюць, ужо сёння адчуваюць праблемы з утрыманнем пенсіянераў. У той жа час мы абсалютна разумеем, што ў сілу гэтага, у сілу сітуацыі, якая складваецца, пенсійны фонд у нас не расце, і нам ужо сёння з бюджэту прыходзіцца фінансаваць пенсійны фонд. Гэта нікуды не варта. Мы такім чынам забіраем ва ўрачоў, настаўнікаў, ваенных і гэтак далей пэўныя сродкі, не развіваем дзяржаўныя і іншыя праграмы, аддаючы грошы на тое, каб падтрымаць пенсіянераў. Гэта дрэнна. У той жа час разумеем, што паменшыць пенсіі нельга. Гэтак жа, як і нельга павялічыць падаткі або сацыяльныя ўзносы, плацяжы ў сацыяльныя фонды. Гэта таксама не шлях. Таму ад прыняцця адпаведных рашэнняў нам нікуды не дзецца», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ва ўдзельнікаў нарады, як складваецца сітуацыя па стварэнні новых працоўных месцаў. «Таму што калі мы ўводзім навацыі ў пенсійную сістэму са студзеня наступнага года, так ці інакш паўстане пытанне па працоўных месцах, — адзначыў Прэзідэнт. — Трошкі павялічыцца колькасць працуючых людзей, яны павінны быць занятыя, і мы да гэтага павінны быць гатовыя». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што адпаведнае рашэнне па стварэнні новых працоўных месцаў прынята. «Майце на ўвазе, што гэта жалезнае рашэнне Прэзідэнта! 50 і больш тысяч працоўных месцаў павінны быць створаны,» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт ужо на наступным тыдні мае намер падпісаць дакументы, якія тычацца ўдасканалення ў краіне пенсійнай сістэмы, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Сёння мы павінны выйсці на вырашэнне гэтай праблемы, каб, як і па ЖКП, так і па гэтым пытанні, паставіць кропку, і на будучым тыдні Прэзідэнт падпісаў адпаведныя дакументы, прыняўшы рашэнне па гэтых пытаннях», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На ўзаемавыгадных умовах

Беларусь і Славенія дамовіліся больш актыўна развіваць усебаковае эканамічнае супрацоўніцтва

Узаемная зацікаўленасць у пашырэнні кантактаў была выказана ў час сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам замежных спраў Славеніі Карлам Эр'яўцам.

Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку за тую пазіцыю, якую ў апошнія гады займала Славенія ў дачыненні да Беларусі, у прыватнасці, пры абмеркаванні праблем з ЕС. «Не думаю, што ў нас былі ці будуць нейкія праблемы на палітычным, дыпламатычным узроўні ці ў адносінах паміж людзьмі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі з рэспублікамі былой Югаславіі, у тым ліку Славеніяй, заўсёды былі добрыя адносіны, якія захаваліся і цяпер.

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што падмуркам двухбаковых адносін з'яўляецца эканоміка. На яго думку, каб надаць стабільнасць эканамічным адносінам, нашым краінам трэба мець некалькі (3-4) буйных сумесных праектаў, і яны ўжо вымалёўваюцца.

У сваю чаргу, Карл Эр'явец сказаў пра тое, што Беларусь у асобе Славеніі заўсёды мае надзейнага прыхільніка. На сустрэчы абмяркоўваліся перспектывы развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі ўзаемавыгадных праектаў, у тым ліку ў сферах энергетыкі, лесаперапрацоўкі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Славенскі бок мае намер развіваць доўгатэрміновыя перспектыўныя праекты з Беларуссю. Кіраўнік дзяржавы запрасіў славенскіх бізнесменаў больш актыўна прыходзіць на беларускі рынак.

Акрамя таго, кіраўнік славенскага МЗС заявіў пра зацікаўленасць у больш хуткім падпісанні дакумента аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж Беларуссю і ЕС.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь гатовая да далейшага ўсебаковага супрацоўніцтва са Славеніяй на ўзаемавыгадных умовах.

■ Кампетэнтна

Не дапусціць росту нагрузкі на тых, хто працуе

На старонках «Звязды» аб маючых адбыцца зменах у пенсійнай сістэме выказвалі думкі і эксперты ў галіне сацыяльнага забеспячэння, і простыя грамадзяне. Сёння мы друкуем вытрымкі з інтэрв'ю, якое намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА дала газеце «СБ. Беларусь сегодня».

***

«Павышэнне планкі пенсійнага ўзросту, перш за ўсё, дасць магчымасць не дапусціць далейшага росту нагрузкі на насельніцтва, якое працуе, збалансаваць даходную і расходную часткі Фонду сацыяльнай абароны. І, акрамя таго, застанецца большая колькасць людзей, якія будуць задзейнічаны ў эканоміцы. Гэта, несумненна, дасць станоўчы эфект — павелічэнне ВУП, рост эканомікі».

***

«На рынку працы, з аднаго боку, будуць заставацца тыя, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту, з другога — прыходзіць моладзь, якая заканчвае ВНУ, ССНУ, ПТВ. Кіраўніком дзяржавы падпісаны Указ №78, у якім выразна пастаўлена задача па стварэнні штогод не менш як 50 тысяч новых працоўных месцаў».

***

«Пенсійныя сістэмы ў краінах ЕАЭС, як і эканомікі, розныя. А ў цэлым, усталёўваючы правілы прадастаўлення сацыяльных выплат, кожная краіна можа арыентавацца толькі на свае рэсурсы. Таму механічнае капіраванне заканадаўства іншай краіны без уліку ўласных магчымасцяў проста нерэальнае. З іншага боку, нельга казаць пра тое, што мы рухаемся не ў рэчышчы адзінай палітыкі. Расія сёння таксама актыўна абмяркоўвае перспектывы павышэння пенсійнага ўзросту і не выключана, што падобную рэформу будзе праводзіць паралельна з намі. Казахстан на падобнага роду перамены даўно пайшоў, у іх планка пенсійнага ўзросту паднятая да 58 гадоў у жанчын і да 63 — у мужчын, і сёння яны ўжо гатовыя пайсці на другі этап павышэння.

***

«Мы не выключаем развіццё назапашвальнага кампанента пенсійнай сістэмы, але пакуль выключна ў добраахвотным фармаце. Цікава тое, што ў шматлікіх развітых краінах — Аўстрыі, Бельгіі, Канадзе, Чэхіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Францыі, Германіі, Італіі, Іспаніі і іншых — дзяржаўныя пенсійныя сістэмы не ўключалі і не ўключаюць абавязковага назапашвальнага ўзроўню... Таму фарміраванне пенсійных накапленняў, з майго пункту гледжання, і ў нас павінна ісці праз удзел у схемах добраахвотнага дадатковага страхавання на прадпрыемствах. Фарміруючы пенсійную сістэму, важна не дапусціць памылак. Для нас у гэтым пытанні важны аналіз вопыту іншых дзяржаў»

■

■ Парламенцкі дзённік

У ЧЭХІІ ВЫСОКА ЦЭНЯЦЬ МІРАТВОРЧЫЯ ІМКНЕННІ НАШАЙ КРАІНЫ

У рамках рабочага візіту нашай парламенцкай дэлегацыі ў Чэхію віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар ГУМІНСКІ сустрэўся з намеснікам міністра замежных спраў гэтай краіны Іва ШРАМЕКАМ. Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты парламента, чэшскі дыпламат высока ацаніў дзейнасць нашай дзяржавы ў пытаннях падтрымкі міру і бяспекі ў рэгіёне Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

Іва Шрамек у размове з Віктарам Гумінскім адзначыў магчымасць падтрымкі нашай краіны ў рамках ініцыятывы Усходняга партнёрства. У сваю чаргу, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што «Рэспубліка Беларусь гатова да паглыблення дыялогу і практычнага супрацоўніцтва ў рамках Усходняга партнёрства пры ўмове яго перафармацiравання».

Віктар Гумінскі таксама абмеркаваў пытанні развіцця супрацоўніцтва паміж парламентамі нашай дзяржавы і Чэхіі з намеснікам старшыні Палаты дэпутатаў парламента Чэхіі Войцехам Філіпам. «Чэшскі дэпутат станоўча адзначыў дасягнуты ўзровень узаемадзеяння паміж групамі сяброўства парламентаў абедзвюх краін», — паведамляе прэс-служба.

У горадзе Усці-над-Лабем парламенцкая дэлегацыя сустрэлася з кіраўніком Эканамічнай палаты Усцецкага краю Чэхіі Ф. Ёхманем, які пацвердзіў, што Чэхія гатова развіваць з намі інвестыцыйнае супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай аснове.

Чэшскія кампаніі былі азнаёмлены з інвестыцыйнымі праектамі і запрошаны да стварэння прадпрыемстваў у Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Грамадская ініцыятыва

ЗРАЗУМЕЦЬ, ЯК РАЗВІВАЕЦЦА СВЕТ

Супрацоўніцтва рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і Нацыянальнай акадэміі навук даўно стала традыцыйным. На гэта звярнуў увагу старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ падчас адкрыцця навукова-практычнага семінара «Беларусь у кантэксце глабальных грамадска-палітычных тэндэнцый», арганізаванага «Белай Руссю» і навукоўцамі.

— Удзельнікі такіх сустрэч спасцігаюць праблемы сацыяльнага развіцця, выпрацоўваюць дзейсныя прапановы і рэалізуюць свайго роду заказ на распрацоўку актуальных падыходаў, методык і тэхналогій, — заявіў ён. — Дзякуючы гэтаму, дасягаецца больш высокая якасць навукова-даследчай працы, узмацняецца яе прыкладное значэнне. Сярод навукоўцаў і спецыялістаў нямала тых, хто бачыць і аналізуе праблемы сучаснага беларускага грамадства сістэмна, хто асэнсоўвае іх у агульнасусветным кантэксце з улікам глабальных выклікаў і пагроз.

— Трэба зразумець, як развіваецца свет, — упэўнены **Аляксандр РАДЗЬКОЎ, старшыня РГА «Белая Русь»**. — Якой можа быць унутраная і знешняя небяспека, нават пагроза? Як нам будаваць грамадства? Як развіваць яго структуру? Як улічыць усе небяспекі і не нарабіць памылак? Гэтыя пытанні трывожаць і гуманітарнае аддзяленне Акадэміі навук, і ВНУ, і лідараў грамадскіх аб'яднанняў, і кіраўніка дзяржавы.

— Толькі праз навукова-тэарэтычнае асэнсаванне, паглыбленне ў філасофскія праблемы развіцця грамадства мы можам паспяхова рухацца наперад, — лічыць **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук.**

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■

■ Акцыя

ПАСАДЗІ ДРЭВА!

У рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2016» прыме ўдзел каля 80 тысяч чалавек

Маштабнае мерапрыемства, прысвечанае 30-годдзю з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС, пройдзе з 2 па 9 красавіка ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Па словах **першага намесніка міністра лясной гаспадаркі Аляксандра КУЛІКА**, за ўсю гісторыю правядзення такіх акцый сёлетняя стане самай масавай. Лясгасы краіны рыхтуюць для ўдзельнікаў акцыі каля 800 аб'ектаў, на якіх валанцёры змогуць пасадзіць лес, прывесці да ладу месцы адпачынку, стварыць памятную алею альбо сквер. У асноўным будуць высаджвацца хвойныя пароды — сасна і елка (70%) — і ліставыя — дуб, бяроза, вольха (30%).

Азнаёміцца з поўным спісам аб'ектаў можна будзе ўжо на наступным тыдні на сайце Мінлясгаса *(www. mlhn.gov.by)*. Для таго, каб прыняць удзел у акцыі, трэба звярнуцца ў бліжэйшы лясгас альбо лясніцтва.

Кацярына РАДЗЮК. *radziuk@zviazda.by*

■

■ Камунальныя стасункі

«Жыроўкі» будуць зразумелымі

А тарыфы — празрыстымі

Менавіта так гучыць галоўная ідэя Указа кіраўніка дзяржавы №107. Сёлета вызначаныя ў ім гранічныя тарыфы будуць дзейнічаць у любым пункце краіны. «Прынятым дакументам зроблены вялікі крок да празрыстасці тарыфаў. А надалей спецыялістам арганізацый пастаўлена задача выкарыстоўваць цалкам зразумелы механізм фарміравання затрат», — падкрэсліў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ. Кіраўнік галіны адзначыў, што цяпер урад вызначыў дакладны алгарытм фарміравання гэтых выдаткаў і так званую планава-разліковую цану, каб выключыць факты безгаспадарчасці і разгільдзяйства, а таксама няпрофільныя выдаткі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ПЛАТА ЗА ДАМАФОНЫ І ЛЬГОТЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Указ № 107 вызначае гранічныя ўзроўні тарыфаў на 14 відаў жыллёва-камунальных паслуг. Вядома, што істотна былі зніжаныя тарыфы на ваду (аб чым мы паведамлялі ўчора). Гэтым дакументам упершыню зацверджаны і адзіны гранічны тарыф на тэхнічнае абслугоўванне дамафонаў — 9100 рублёў з кватэры для ўсіх арганізацый незалежна ад формы ўласнасці. «Але гэтая плата бярэцца пры ўмове, калі людзьмі былі заключаны дагаворы з арганізацыяй па абслугоўванні, бо гэтая паслуга з'яўляецца дадатковай», — растлумачыў Аляксандр Церахаў.

Важнай навацыяй дакумента з'яўляецца льгота для дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў, якія вызваляюцца ад платы за тэхнічнае абслугоўванне ліфтаў і за іх электразабеспячэнне, а таксама за прыборку месцаў агульнага карыстання.

ТАРЫФЫ «ПРЫВЯЖУЦЬ» ДА ЧАЛАВЕКА

— Цяпер налічэнне платы за электраэнергію па спецыяльных тарыфах пенсіянерам і інвалідам магчыма па месцы іх знаходжання, выбар за чалавекам, — адзначыў Аляксандр Церахаў.

Ён растлумачыў, што асабліва гэта актуальна для тых, хто ў летні перыяд з'язджае за горад. «Тарыф будзе прывязаны альбо да кватэры, дзе чалавек зарэгістраваны, альбо, па яго жаданні, да індывідуальнага дома ў вёсцы альбо ў іншым населеным пункце», — сказаў міністр.

«ЗАЛАТАЯ» ВАДА ДЛЯ ПУСТОЙ КВАТЭРЫ БЕЗ ЛІЧЫЛЬНІКА

У новым дакументе прадугледжана вызначэнне аплаты за паслугі водазабеспячэння ў пустых дамах (кватэрах), дзе не ўстаноўлены індывідуальныя прыборы ўліку вады. Налічэнне за паслугу водазабеспячэння ў гэтым выпадку будзе вызначацца зыходзячы з разліковай колькасці грамадзян. Умоўна кажучы, будзе лічыцца, што на кожных 20 квадратных метрах пустой кватэры жыве адзін чалавек.

Напрыклад, для пустой сталічнай трохпакаёвай кватэры плошчай больш за 60 квадратных метраў будзе брацца плата з трох жыхароў па 260 літраў вады ў суткі на чалавека па максімальным кошце. «Норма даволі жорсткая, але неабходная, каб прымусіць паставіць лічыльнікі паўсюдна. Больш за тое, яна ўступіць у сілу з 1 кастрычніка 2016 года», — растлумачыў сітуацыю Аляксандр Церахаў.

Не сакрэт, што ў пустых на паперы кватэрах людзі пражываюць або здаюць іх у арэнду нелегальна, пры гэтым, не маючы прыбора ўліку вады, карыстаюцца паслугамі водазабеспячэння. Цяпер у краіне 98% жылога фонду абсталявана індывідуальнымі прыборамі ўліку вады, але ў галіне лічаць неабходным прастымуляваць і астатніх грамадзян да ўстаноўкі лічыльнікаў. Цяпер у іх будзе яшчэ паўгода, каб гэта зрабіць.

Калі гэтага не зрабіць, то і надалей могуць узнікаць розныя нестыкоўкі. Так, летась толькі сталіца не атрымала плату за 9 млн кубаметраў вады, якая была пастаўлена жыллёваму сектару, але ў лічыльніках зафіксавана не была.

Аналагічная норма ў 20 кв.м будзе тычыцца платы ў пустых дамах за тэхабслугоўванне ліфта, санітарнае ўтрыманне дапаможных памяшканняў жылога дома, за электраэнергію пад'ездаў і працу абсталявання. Ацяпленне ў пустых кватэрах будзе аплачвацца па тарыфах, якія цалкам пакрываюць затраты на такую паслугу.

КРОПКА Ў СПРАВЕ ЛІФТА

Дакумент удакладняе, што не трэба плаціць за ліфт і электраэнергію на яго рух тым жыхарам дамоў, якія па стане здароўя не могуць ім карыстацца або маюць кватэры на першых паверхах. Прапісана цяпер і норма, якая дазваляе заблакіраваць кнопку ліфта на другім паверсе і не плаціць за яго. «Заблакіраваць кнопку ліфта другога паверху можна, калі ўсе згодныя менавіта на вашай пляцоўцы. Тады кнопка блакіруецца, і гэтыя грамадзяне вызваляюцца ад аплаты за карыстанне ліфтам», — растлумачыў міністр.

Пры гэтым Аляксандр Церахаў падкрэсліў, што плата за тэхабслугоўванне ліфта і прыборку пад'ездаў цяпер будзе падлічвацца ў разліку на чалавека, а не ў залежнасці ад плошчы кватэры. «Для людзей усё ж такі бліжэй прывязка не да квадратных метраў, а да чалавека. У ліфце ездзіць чалавек, ён карыстаецца месцам агульнага карыстання, таму мы пачулі заўвагі людзей», — удакладніў спадар Церахаў.

У ЭЛЕКТРОНЦЫ — ХОЦЬ СЁННЯ

Аплаціць жыллёва-камунальныя паслугі за люты мінчане змогуць з 26 сакавіка, паведаміў першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў.

Цяпер практычна завершана налічэнне і перараслік платы за аказаныя паслугі. Яшчэ ў пятніцу планавалася выставіць плацежныя дакументы ў электроннай сістэме komplat.by. А аплаціць ЖКП на пошце і ў банку мінчане змогуць з 26 сакавіка.

Дастаўка насельніцтву паведамленняў аб аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі ў Мінску будзе ажыццяўляцца 26, 27 і 28 сакавіка. Папяровы варыянт жыровак усе мінчане змогуць пабачыць абавязкова да 29 сакавіка.

У сваю чаргу Аляксандр Церахаў нагадаў, што аплаціць лютаўскія жыроўкі беларусы змогуць да 5 красавіка без збірання пені і штрафу.

ЗА КОШТ УНУТРАНЫХ РЭЗЕРВАЎ

Тарыфы на год вызначаны. У Міністэрстве эканомікі цяпер дакладна падлічылі, колькі сёння пакрываецца па кошце ЖКП на прыкладзе стандартнай двухпакаёвай кватэры. Узровень кампенсацыі насельніцтвам па камуналцы цяпер складае крыху больш за 40%. Пры гэтым да канца года перад галіной пастаўлена задача выйсці на ўзровень не менш за 50%. Аднак цяпер гэта трэба зрабіць не за кошт павышэння тарыфаў, а за кошт зніжэння ўнутраных выдаткаў і непрадукцыйных страт.

Аляксандр Церахаў растлумачыў, што ў міністэрстве прааналізавалі рэзервы галіны і ацанілі іх у памеры 2,5 трлн рублёў. «Гэта сур'ёзная задача, якая стаіць перад усімі арганізацыямі ЖКГ, але ўжо распрацаваны дакладныя планы мерапрыемстваў, дзе прапісана ўсё, што трэба зрабіць», — адзначыў ён.

ДВУХБАКОВЫЯ ЖЫРОЎКІ АТРЫМАЕМ УЖО Ў МАІ

Кіраўніцтва ЖКГ ужо сёння прынцыпова вызначылася, як будзе выглядаць рахунак-паведамленне. Самае галоўнае, што, з аднаго боку, яно павінна быць максімальна інфарматыўным, з другога — простым для ўспрымання.

Паводле слоў міністра, плануецца, што жыроўка будзе двухбаковай. «Для тых, каму дастаткова паглядзець на кошт паслуг і на тое, як яны разлічаны, будзе інфармацыя на адной старонцы. Для тых, хто хоча больш дэталёва і ўедліва паглядзець, з чаго склаліся затраты, які ўзровень кампенсацыі, — калі ласка, на адваротным баку будзе прыведзена гэтая інфармацыя. Спажывец зможа пралічыць, пераправерыць і быць проста праінфармаваным па тых момантах, якія там будуць пазначаны», — растлумачыў міністр.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Скандал, якога не было

ДЫ ХОЦЬ ТЫ ДВОЙЧЫ «КАРОЛЬ»...

Мытнікі не даюць паблажак нікому, хто перасякае дзяржаўную мяжу

«Беларуская мытня сарвала канцэрт Кіркорава» — падобнымі загалоўкамі стракацелі інфармацыйныя стужкі інтэрнэта і газетныя старонкі. Кароль расійскай поп-сцэны не паспеў у Вільнюс «з-за беларускіх мытнікаў». Пра гэта ён сам напісаў у сацыяльных сетках, абураючыся, што на мяжы Беларусі і Літвы доўга не прапускалі фуры з абсталяваннем і аўтобусы з персаналам. Маўляў, іх трымалі на даглядзе ледзь не цэлы дзень.

Але, мяркуючы па ўсім, «зорка» крыху перабольшыла... Прынамсі, у Дзяржаўным мытным камітэце нам прывялі канкрэтныя факты, падмацаваўшы іх лічбамі і бясспрэчнымі аргументамі.

— 23 сакавіка 2016 года ў пункт пропуску «Каменны Лог» прыбылі чатыры грузавыя транспартныя сродкі, у якіх перамяшчалася абсталяванне для гастрольнага тура Філіпа Кіркорава, — расказвае **начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей ФЁДАРАЎ**. — Таксама ў пункт пропуску прыбылі два аўтобусы з суправаджальным персаналам. У 11.50 у мытныя органы кіроўцамі грузавых транспартных сродкаў былі прадастаўлены дакументы. У 12.30 афармленне дакументаў завяршылася — гэта значыць, што на афармленне кожнага транспартнага сродку было затрачана не больш чым 10 хвілін. Што тычыцца кіроўцаў аўтобусаў, то імі загадзя не былі падрыхтаваны фармуляры — так названыя спісы пасажыраў, абавязковая наяўнасць якіх прадугледжана спецыяльным пагадненнем паміж Расійскай Федэрацыяй і Літвой, а таксама заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб міжнародных перавозках пасажыраў. Кіроўцам было аказана садзейнічанне ў запаўненні дакументаў. Пасля таго як у 14.10 супрацоўнікам мытні былі прадстаўлены фармуляры, на працягу 18 хвілін два пасажырскія аўтобусы былі афармлены. Такім чынам, супрацоўнікі мытні затрацілі менш чым 9 хвілін на афармленне кожнага транспартнага сродку.

Выходзіць, змены ў гастрольным графіку артыста адбыліся не з-за беларускіх мытнікаў. Яны вельмі прафесійна і аператыўна выканалі сваю справу. А калі хтосьці разлічваў на праезд без мытнага дагляду, то ў той сітуацыі, калі ўвесь свет у сувязі з тэрарыстычнай небяспекай пераведзены ў напружанае становішча, гэта было немагчыма. І няважна, каму гэтыя транспартныя сродкі належаць.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

белагропромбанк

С 01 апреля 2016 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 15.03.2016 № 131 размер ставки рефинансирования установлен в размере 24,0 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об уменьшении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 1 процентный пункт с 27.04.2016.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

белагропромбанк

ОАО «Белагропромбанк» информирует, что в соответствии с решением Комитета по управлению активами и пассивами ОАО «Белагропромбанк» от 18.03.2016, протокол № 24, с 01.04.2016 размер процентной ставки по вновь заключаемым договорам банковского вклада (депозита) физических лиц до востребования составит:

в белорусских рублях – 2% годовых;

в иностранной валюте – 0,1% годовых.

Данный размер процентных ставок применяется с 01.04.2016:

для ранее заключенных договоров банковского вклада (депозита) физических лиц до востребования в белорусских рублях;

для вновь заключаемых договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный»;

для договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенных в период с 25.11.2015 по 31.03.2016.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

■ Здарэнні

МАК НА МІЛЬЯРДЫ

Супрацоўнікі сталічнага наркакантролю пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» у адным з гаражных кааператываў выявілі і канфіскавалі каля двух тон насення маку.

Гараж належаў 58-гадовай пенсіянерцы, якая здавала яго ў наём. Падчас вобыску наркакантралёры знайшлі там 9 папяровых мяхоў, 44 паліморныя і яшчэ 18 скрынь з насеннем маку. Агулам кошт канфіскаванага складае каля двух мільярдаў рублёў. Да слова, на «чорным рынку» адзін кілаграм маку каштуе мільён рублёў, а пры набыцці ўначы — ужо 1,3 мільёна рублёў. Цяпер вядуцца пошукі ўладальніка наркасыравіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Руденский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного в Руденском сельсовете

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь (га)	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (рублей)	Затраты	Задаток (рублей)
1	д. Анетово, ул. Лесная, д. 26. Кадастровый номер 624485700101000419	0,1499	Сети электроснабжения, водоснабжения, газовый кооператив	64 852 900	15 506 800	6 485 300

Аукцион состоится **29 апреля 2016 года в 10.00** по адресу: г.п. Руденск, ул. Ленинская, д. 17 Пуховичского района Минской области. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 25 апреля 2016 года до 17.00** по вышеуказанному адресу. Контактные телефоны: **(801713) 6 32 80, 6 32 75, 6 31 80.** Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

УНН 600177785

ШКОЛЬНАЯ АДЗНАКА:

Мікалай ЗАПРУДСКІ.

Алена РАДЗЕВІЧ.

Алена ПАЛЕЙКА.

Тамара МАЦКЕВІЧ.

Міхаіл КУДЗЕЙКА.

Святлана ЛОКІС.

Святлана ПАЛЯНСКАЯ.

Вучоба за ўзнагароду?

«ЗВЯЗДА»: ***Сёння ўвогуле без адзнак у беларускай школе навучаюцца толькі вучні першых і другіх класаў. Праўда, адзнакі многія настаўнікі ўсё роўна замяняюць на зорачкі, сонейкі, флажкі і гэтак далей, каб зафіксаваць наперад рух у вучобе сваіх вучняў. Кажуць, што без выстаўлення адзнакі ў дзённіку цяжка растлумачыць бацькам, на якім узроўні развіцця знаходзіцца іх дзіця. Вось і атрымліваецца, што ў аднаго дзіцяці шмат зорачак, а ў другога іх увогуле няма. Прычым гэта дзіця разумее, што ніколі не дагоніць сваіх больш паспяховых аднакласнікаў, і цікавасць да вучобы ў яго знікае. Як вы лічыце, ці магчыма адмовіцца ад мадэлі канкурэнтных адносін у школе?***

Міхаіл КУДЗЕЙКА:

— Пакуль у школе дзейнічае рэйтынгавая сістэма, ад канкурэнцыі нам не пазбавіцца. Нельга скідваць з рахункаў і стэрэатыпы, якія склаліся ў дзяцей і дарослых у дачыненні да школы. Давайце прызнаемся: мы не ўяўляем сабе школу без адзнак. Вучыцца — азначае для нас атрымліваць адзнакі. Ацаніць працу вучня — значыць, абавязкова паставіць яму адзнаку. Каб пакараць ці падтрымаць дзіця — выстаўляецца адзнака ў дзённік і журнал. Бацькі пытаюцца ў дзяцей аб тым, што яны атрымалі ў школе. А ў гутарках з сябрамі ці калегамі цікавяцца, як вучацца іх дзеці...

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Адзнака ператварылася ў нашым грамадстве ў сімвал паспяховасці, як новая мадэль машыны, дарагі гадзіннік ці адзенне вядомага брэнда. Добрымі адзнакамі дзяцей можна пахваліцца перад знаёмымі і суседзямі, як, напрыклад, новай мадэллю смартфона. Што маюць на ўвазе дарослыя, калі пытаюцца ў дзіцяці, як ты вучышся? Натуральна, якія адзнакі атрымліваеш? Нікога, насамрэч, не хвалююць веды вучня. Галоўнае — мець добрыя адзнакі. І гэтыя чаканні перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Дзеці прызвычайваюцца працаваць за ўзнагароду — адзнаку, пахвалу, значок выдатніка...

Ужо ў пачатковай школе пачынаецца падзел вучняў на паспяховых і непаспяховых, такім чынам у дзіцячым калектыве ўзнікае канкурэнцыя. А ў любой спаборніцкай сітуацыі ёсць як пераможцы, так і аўтсайдары. Тым дзецям, хто адстае ў вучобе, даводзіцца не салодка, асабліва, калі яны зноў і зноў атрымліваюць дрэнныя адзнакі. Такі вучань можа назаўжды страціць веру ў сябе. Менавіта таму ў многіх краінах свету ў пачатковай школе адзнак увогуле не выстаўляюць (у тым ліку і ўмоўных значкоў, якія насамрэч выконваюць тую ж мэту, што і адзнакі), замяняючы ацэньванне ў балах актыўнай ацэнкай.

Святлана ЛОКІС:

— Я цудоўна памятаю, што калі ў першым і другім класах толькі ўводзілася безадзнакавае навучанне, рэакцыя з боку настаўнікаў была вельмі негатыўная. Адзнака настолькі важны для нашай школы атрыбут, што адмовіцца ад яе педагогі былі на той момант не гатовыя. Прайшоў час, але педагагічная грамадскасць па-ранейшаму «бурліць»: ёсць настаўнікі, упэўненыя, што без адзнак школа існаваць не можа, і яны выступаюць за іх вяртанне, але шмат настаўнікаў перакананыя, што адзнак, асабліва ў пачатковай школе, увогуле не павінна быць. Я адношуся да апошняй катэгорыі.

11 гадоў «школьнага зняволення»

«ЗВЯЗДА»: ***І ўсё ж такі хто, на вашу думку, у школе галоўная фігура: вучань з яго патрэбамі ці настаўнік, у руках якога маецца ўвесь арсенал для пакарання? Не сакрэт, што «дзясятка» ці «дзявятка», атрыманыя ў аднаго настаўніка, могуць быць нераўназначныя «дзявяткам» і «дзясяткам», атрыманым у іншага настаўніка. А некаторыя настаўнікі прынцыпова не выстаўляюць «дзясятак». Наколькі ўвогуле адзнака можа быць аб'ектыўнай?***

Міхаіл КУДЗЕЙКА:

— На сённяшні дзень, галоўным застаецца настаўнік са сваім арсеналам «каральных» інструментаў. Адзнака — адзін з іх. Часта гэты інструмент выкарыстоўваецца суб'ектыўна, эмацыйна і безрэфлексіўна. Для настаўніка адзнака — вельмі зручная: яна заўсёды пад рукой, мае цану ў вачах бацькоў, уплывае на сярэдні бал атэстата, а значыць, можа выкарыстоўвацца як рычаг для ўзмацнення ўздзеяння на вучня, яго паводзіны і паспяховасць. Для педагога яна зручная яшчэ і тым, што не патрабуе рэфлексіі, зваротнай сувязі (з вучнямі, бацькамі), дадатковай працы. Усе праблемы лёгка перакладаюцца на плечы вучняў: не вывучыў, не зразумеў, не паспеў — сам вінаваты, іншы раз рабі лепш, паспявай, задавай настаўніку пытанні. Галоўнае ў сюжэтна-ролевай гульні пад назвай «Школа» ўсім развесіць ярлыкі — «выдатнік», «харашыст», «гультай», «дурань» — і зняць з сябе адказнасць. На жаль, але нярэдка можна пачуць ад настаўніка і фразу кшталту «Ну як можна быць такім гультаём?» ці яшчэ горш «Як можна быць такім дурнем?». Але ж ці вінаватае дзіця ў тым, што ў яго ад прыроды няма здольнасцяў да тых ці іншых навук? Не!!!

Трэба, нарэшце, зразумець, што ўсе мы — розныя. Ад прыроды розныя. У нас розныя цікавасці і магчымасці. Дык чаму мы на працягу ўсяго навучання ў школе фарміруем у многіх дзяцей комплекс «двоечніка» і тым самым адбіваем у іх жаданне вучыцца? Вось і даводзіцца ім хадзіць у школу, як на катаргу, каб атрымаць атэстат. «Тэрмін зняволення», між іншым, складае 11 гадоў!

Святлана ЛОКІС:

— Працуючы ў пачатковых класах больш як 25 гадоў, я разважала над тым, чаму ў пачатковай школе бацькі ахвотна прыходзяць на бацькоўскія сходы, а ў сярэдняй і старшай школе шэрагі бацькоў радзеюць... Прычым на запрашэнні настаўніка завітаць у школу хутчэй адгукаюцца бацькі паспяховых дзяцей.

Мяркую, таму, што ў першыя гады вучобы дзіцяці бацькі максімальна зацікаўленыя ў тым, каб атрымаць ад настаўніка зваротную сувязь. Але што адбываецца далей? Настаўнік сістэматычна выстаўляе пэўнаму вучню нізкія і сярэднія адзнакі. Наколькі яны інфарматыўныя для бацькоў? Упэўнена, што вельмі інфарматыўныя, таму што праз адзнаку бацькі атрымліваюць ад настаўніка негатыў пра сваё дзіця. І навошта ім ісці на бацькоўскі сход, каб яшчэ раз пачуць тое, пра што яны і так ужо здагадваюцца.

А калі няма пасярэдніка, у ролі якога выступае адзнака, у дарослых узнікае патрэба асабіста даведацца аб праблемах і поспехах вучобы свайго дзіцяці ў школе. Адзнака на пэўным этапе адсякае ўзаемадзеянне бацькоў з настаўнікам.

Алена РАДЗЕВІЧ:

— У цэнтры ўсяго адукацыйнага працэсу адназначна павінен быць вучань з яго індывідуальнымі патрэбамі і магчымасцямі. А задача настаўніка — выбудаваць адукацыйную траекторыю з улікам магчымасцяў кожнага дзіцяці, падзяліцца сваёй уладай з вучнямі, прыцягнуць іх да планавання ўрока, аналізу і ацэнкі. Сучасны настаўнік не павінен заставацца манапалістам адукацыйнага працэсу, а менавіта гэта мы сёння і назіраем. Настаўнік — ключавая фігура ў стварэнні атмасферы адкрытасці, падтрымкі і матывацыі да навучання. Актыўная ж ацэнка (АА. — **Аўт.**) дае зваротную сувязь, дае дзіцяці інфармацыю, якая дапамагае яму вучыцца, пераадольваць цяжкасці...

Алена ПАЛЕЙКА:

— ...І браць адказнасць за сваё навучанне. А калі ў цябе няма адказнасці, то аб якім самастойным прыняцці рашэнняў і праектаванні ўласнага жыцця можа весціся гаворка?

Сярод ключавых кампетэнцый чалавека, на фарміраванне і развіццё якіх павінна працаваць сучасная школа, ёсць такія, як уменне сумесна вырашаць праблемы, супрацоўнічаць у камандзе. І менавіта ад таго, наколькі мы навучымся гэта рабіць, і будзе залежаць у выніку канкурэнтаздольнасць нашага грамадства і нашай эканомікі. Адзначым, што з 2015 года гэта кампетэнцыя дадаткова маніторыцца падчас правядзення міжнароднага даследавання якасці адукацыі PISA. А стратэгія актыўнага навучання якраз і стымулюе супрацоўніцтва: супрацоўніцтва настаўніка і вучня, супрацоўніцтва навучэнцаў паміж сабой, супрацоўніцтва адміністрацыі і настаўнікаў, бацькоў і настаўнікаў.

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— Актыўная ацэнка прынцыпова пазбягае канкурэнцыі. Настаўнікі, якія яе выкарыстоўваюць, перакананы, што кожны вучань можа дасягнуць многага, і робяць акцэнт на яго поспехах у навучанні без параўнання з іншымі вучнямі.

Святлана ПАЛЯНСКАЯ:

— Мяркую, што задача настаўніка — вучыць, а ацэньваць яго працу павінны іншыя. А ён сёння сам выступае ацэншчыкам сваёй працы. Сам навучыў — сам выставіў адзнаку. Лічу, што школьныя адзнакі не павінны заставацца ў цяперашнім выглядзе. Я таксама некалькі гадоў цікавілася, якую адзнаку атрымала ў школе мая дачка. І разважала прыкладна так: калі яна атрымала «шасцёрку», то гэта ўжо дрэнна. А потым да мяне прыйшло разуменне, што, можа быць, тая ж «шасцёрка» майму дзіцяці даецца больш складана, чым камусьці «дзявятка» ці «дзясятка». А калі дачка старалася? Я бачу, што ёй цяжка даецца руская мова. Таму заўсёды пытаюся ў настаўніцы, ці прыкладала намаганні маё дзіця? Калі яна працуе на мяжы сваіх магчымасцяў, значыць, яна малайчынка. Галоўнае, каб у дзіцяці захоўваўся стымул да вучобы і ўласнага росту...

Глядзець не толькі пад ногі

«ЗВЯЗДА»: ***Ці можна назваць актыўную ацэнку рухам у бок супрацоўніцтва ў школе дарослых і дзяцей? У чым заключаецца яе сутнасць?***

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Менавіта рухам, бо чым больш мы паглыбляемся ў філасофію актыўнай ацэнкі, тым больш разумеем, што гэта найлепшая мадэль навучання, якая пабудавана на гуманістычных пачатках, на дыялогу і супрацоўніцтве. Не верце тым, хто заяўляе, што і 10, і 20 гадоў таму назад мы вучылі дзяцей менавіта так, проста не ведалі, што гэта называецца актыўнай ацэнкай. Такія заявы — жаданне сябе ўзвысіць. Асобныя прыёмы і сродкі некаторымі педагогамі выкарыстоўваліся, а цэласная тэхналогія, на жаль, не прымянялася.

У чым яна заключаецца? Актыўная ацэнка — тэхналогія навучання, у межах якой вучні маюць магчымаць пастаянна бачыць і разумець свае поспехі і няўдачы (радавацца першым і ліквідаваць прабелы); авалодваць працэдурамі ацэнкі, кіраваць сваім навучаннем.

Міхаіл КУДЗЕЙКА:

— Сучасная школа адстае ў сваім развіцці ад грамадства і яго запытаў, якія ўжо даўно пайшлі наперад, патрабуючы ад адукацыі якасных зменаў у адносінах да асобы і яе ведаў, якія гарантуюць паспяховасць у жыцці. Настаўнік верыць у тое, што ён — адзіная крыніца ведаў і нясе гэтыя веды, як сцяг, патрабуючы да сваёй асобы ўвагі і павагі. Для вучняў такая пазіцыя настаўніка даўно не актуальная, што прывяло да зніжэння матывацыі да навучання ў школе.

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Кожны, хто хадзіў у пешыя паходы, ведае, як шмат залежыць ад сцежкі. Камяністая, з каранямі, што тырчаць у розныя бакі, прымушае ўдзельнікаў паходу засяродзіць практычна ўсю сваю ўвагу толькі на тым, каб не ўпасці, не звяртаючы ўвагу на прыгажосць прыроды і змястоўныя складнікі паходу. Падобным чынам атмасфера канкурэнцыі і ўспрымання вучня як аб'екта навучання вымушае дзяцей прыкладаць намаганні, каб адпавядаць толькі знешнім фармальным аспектам навучання і ацэньвання, адцягваючы ўвагу ад унутранай матывацыі і самаразвіцця. Актыўная ж ацэнка спрыяе стварэнню ў класе асяроддзя для эфектыўнай разумовай дзейнасці і навучання. Калі настаўнік выкарыстоўвае актыўную ацэнку сістэматычна, то вучні пачынаюць разумець, як адбываецца працэс навучання, для чаго яны ходзяць у школу, з мужнасцю прымаюць свае адукацыйныя вынікі, вераць у тое, што яны могуць вучыцца лепш, актыўна супрацоўнічаюць, бяруць адказнасць за сваё навучанне.

Данута Стэрна, польскі эксперт у актыўнай ацэнцы, назвала яе новай адукацыйнай філасофіяй. Актыўная ацэнка складаецца з важных элементаў, якія дапамагаюць зрабіць працэс навучання больш дэмакратычным, скіраваным на асобу кожнага вучня. Чаму філасофія? Таму што патрабуе ад настаўніка прыняць новую ролю і адмовіцца ад стэрэатыпаў, якія склаліся ў традыцыйнай адукацыйнай мадэлі. Па-першае, настаўніку трэба прыняць ідэю, што ўсе вучні могуць вучыцца: кожны на сваім узроўні, паступова пераадольваючы прыступку за прыступкай, пры адпаведнай падтрымцы настаўніка. А памылкі — гэта натуральны складнік навучальнага працэсу. Адна са стратэгій АА — вучымся на памылках. Калі педагог дае магчымасць памыляцца, істотна змяняюцца паводзіны вучня, яны смялей пачынаюць выказвацца, дзяліцца цікавымі ідэямі, задаваць пытанні, агучваць гіпотэзы.

Па-другое, настаўнік прадастаўляе вучням выбар, а выбар — гэта адказнасць. Вучань можа выбіраць: або атрымаць адзнаку за выкананую працу, або замест адзнакі — камента-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПЕРНІК ЦІ БІЗУН?

рый ад настаўніка, які з'яўляецца фундаментам актыўнай ацэнкі. Праз каментарый настаўнік паказвае моцныя бакі вучня, прабелы ў засваенні матэрыялу, дае рэкамендацыі, як іх выправіць.

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— Актыўная ацэнка падказвае вучню, у якім напрамку рухацца. Няма сэнсу спісваць, бо сябе ж не падманеш. Ядром актыўнай ацэнкі з'яўляецца зваротная сувязь. Пры гэтым актыўная ацэнка не разглядае ацэньванне як кантроль, яна дазваляе эфектыўна матываваць вучняў, прымушае іх браць на сябе адказнасць за сваё навучанне. Да ацэначнай дзейнасці далучаюцца і бацькі вучняў.

Зноў «двойка»?

«ЗВЯЗДА»: ***А як праходзіць урок у класе, дзе і педагог, і вучні прынялі новую філасофію? І каму ўвогуле прасцей упісацца ў новыя рэаліі: настаўніку ці вучням?***

Алена ПАЛЕЙКА:

— Каб зразумець розніцу, я прывяду вынікі маніторынгу ўзроўню навучанасці школьнікаў за мінулы навучальны год, які праводзіць Нацыянальны інстытут адукацыі. Маніторынг праводзіцца па розных прадметах, але я гісторык, таму буду казаць пра прадмет «Сусветная гісторыя». У ходзе анкетавання навучэнцаў было ўстаноўлена, што на вучэбных занятках па суветнай гісторыі амаль дзве трэці вучняў няўважліва слухаюць адказы сваіх аднакласнікаў, не дапаўняюць адказы аднакласнікаў і не выпраўляюць іх памылкі. Палова вучняў не выконваюць усе заданні, што прапануюцца настаўнікам, і не задаюць пытанні, калі штосьці не зразумелі на ўроку. 28% школьнікаў у той час, калі адказваюць іх аднакласнікі, рыхтуюцца да другога пытання, па якім іх могуць выклікаць. Аналагічныя праблемы выяўленыя і па матэматыцы, біялогіі, фізіцы. Паглядзім, ці магчыма такое ў рамках актыўнай ацэнкі?

Ядро актыўнай ацэнкі — гэта пастаянная інтэрактыўная зваротная сувязь. Адна з галоўных памылак многіх настаўнікаў — меркаванне, што зваротная сувязь — гэта любая інфармацыя, якую ён прадастаўляе вучню і бацькам. «Алесь, на жаль ты не справіўся з рашэннем задачы! Зноў «двойка»!» — гэта не зваротная сувязь, бо вучань атрымлівае ад настаўніка не каментар з рэкамендацыямі па паляпшэнні сваіх вынікаў, а адразу — адзнаку.

Добры каментар — гэта майстэрства. Ен заўсёды павінен уключаць чатыры элементы: падкрэсліванне і пахвалу станоўчых бакоў працы вучня, указанне таго, што павінна быць выпраўлена, над чым трэба папрацаваць дадаткова, падказкі, як гэта можна зрабіць, і парады, у якім напрамку вучань павінен працаваць далей.

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Усё навучанне ў межах актыўнай ацэнкі пранізана зваротнай сувяззю: ад настаўніка да вучня, ад настаўніка да бацькоў, ад вучня да друга вучня, ад вучня да бацькоў. Зваротная сувязь з'яўляецца асновай мабільнасці ўсіх удзельнікаў працэсу.

Кантракт паміж вучнем і педагогам

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— У традыцыйнай школьнай практыцы настаўнік не заўсёды паведамляе вучням крытэрыі ацэнкі іх працы — на што ён будзе звяртаць увагу пры ацэньванні. На пытанне вучняў, што настаўнік будзе пытацца, той адказвае: «Вучыце ўсё!»

Носьбіты філасофіі актыўнай ацэнкі карыстаюцца абрэвіятурай «НаШтоБуЗу» — гэта крытэрыі ацэнкі, інфармацыя для вучняў — на што настаўнік будзе звяртаць увагу. Так бы мовіць, кантракт паміж вучнем і педагогам на канкрэтны ўрок. Калі педагог адразу вызначае крытэрыі поспеху, вучань дакладна ведае, якую працу ён павінен выканаць, якімі будуць чаканні настаўніка, а настаўнік не мае праблем з ацэнкай працы вучня. Такая яснасць — адзін з элементаў стварэння атмасферы, што грунтуецца на даверы да настаўніка і на самастойнасці вучня. З «НаШтоБуЗу» вучань адчувае сябе на ўроку больш упэўнена. Вельмі часта вучань пры адказе ля дошкі кажа: «Я не ведаў, што вы будзеце пра гэта пытацца...» З «НаШтоБуЗу» такія сітуацыі не ўзнікаюць. На практыцы агучванне крытэрыяў можа адбывацца на кожным уроку. Калі настаўнік дзеліцца з вучнямі сваімі «сакрэтамі», тыя перастаюць быць проста сузіральнікамі, а становяцца актыўнымі ўдзельнікамі навучальнага працэсу.

Бываюць урокі, дзе дзеці працуюць па прынцыпе «калі не дабяжым, дык хоць сагрэемся». Ці не ведаюць, куды бегчы. А «НаШтоБуЗу» — гэта маркеры, каб вызначыцца, ці не збіліся са шляху да мэты.

Разам з тым хачу заўважыць, што актыўная ацэнка не выключае выстаўлення адзнак. Але калі выстаўляецца адзнака ў балах, то вучань дакладна ведае крытэрыі, чаму ён атрымаў «8», «9» ці «10» балаў. І ён можа сам сябе праверыць. У настаўніка няма ўлады, каб панізіць яму адзнаку, скажам, за дрэнныя паводзіны.

Алена ПАЛЕЙКА:

— У фокусе актыўнага навучання — не адзнака, а менавіта ацэнка. Вучань прымае актыўны ўдзел ва ўласным навучанні, бо дыягностыка адбываецца ў першую чаргу для яго. Ён мае ад настаўніка каментарый — гэта і ёсць зваротная сувязь. Вучань ведае крытэрыі поспеху і не баіцца рабіць памылкі. У нашай краіне выкарыстоўваецца 10-бальная шкала, дзесьці — 12-бальная ці нават 100-бальная. Але калі ёсць канкрэтныя крытэрыі поспеху, то вучань без праблем упішацца ў любую новую рэчаіснасць.

Святлана ЛОКІС:

— На мой погляд, вучням і сапраўды прасцей упісацца ў новыя рэаліі, таму што дзеці — гэта пластылін. Пры актыўнай ацэнцы ў вучня няма залежнасці ад адзнакі. І гэта вялікі плюс. Ён задаволены тым, як ацанілі працу яго аднакласнікі, і як, у першую чаргу, ён сам сябе ацаніў. Самаацэнка — магутны рухавік навучання.

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— У кожнага дзіцяці свая хуткасць навучання, і актыўная ацэнка дазваляе кожнаму выбраць хуткасць, з якой навучацца.

Поспех або няўдача ў балах

«ЗВЯЗДА»: ***Не магу не пацікавіцца, а наколькі актыўная ацэнка ўпісваецца ў рэаліі і магчымасці нашых настаўнікаў? Адзнакі за кантрольныя работы, за чвэрць, гадавыя адзнакі ніхто ж не адменіць? Да таго ж рэйтынгавая сістэма патрабуе ад настаўніка наяўнасці мноства балаў у класным журнале і дзённіках. І настаўнік вымушаны «на гара» выдаваць патрэбную іх колькасць.***

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Сямігадовы вопыт укаранення актыўнай ацэнкі ў Беларусі сведчыць, што актыўная ацэнка можа паспяхова прымяняцца ў нашай школе. Больш за тое, Інструктыўна-метадычны ліст Міністэрства адукацыі «Аб арганізацыі працы агульнаадукацыйных устаноў па ажыццяўленні кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці...» утрымлівае наступную рэкамендацыю для настаўнікаў: «Змястоўны кантроль і ацэнка будуюцца на аснове крытэрыяў і іх паказчыкаў, якія павінны быць адназначнымі, выразнымі і зразумелымі для навучэнцаў...» Справа ў тым, што крытэрыяльная (дадаткова да бальнай) ацэнка — адзін з асноўных прынцыпаў тэхналогіі актыўнай ацэнкі.

Адзнакі за кантрольныя работы, за чвэрць, гадавыя адзнакі і не трэба адмяняць. Яны павінны быць. Калі вучым, то прымяняем ацэнку па крытэрыях, якая дае і настаўніку, і вучню інфармацыю аб тым, у чым ён паспяховы, чаму ўжо навучыўся, што і як патрэбна ўдасканаліць. Калі ж завяршаецца вучэбны раздзел, чвэрць, ажыццяўляецца грунтоўная праверка і выстаўляюцца балы.

І актыўная, і выніковая ацэнкі робяцца на падставе крытэрыяў «НаШтоБуЗу», якія вядомы не толькі настаўніку, а і вучням. Але актыўная ацэнка (у адрозненне ад выніковай, якая часта служыць толькі для знешняй справаздачы) — больш інфарматыўная. Калі падсумоўваючая ацэньвае поспех або няўдачу вучня ў балах, то актыўная — дае зваротную сувязь: што вельмі добра, што добра, чаго бракуе, што і як трэба палепшыць. Актыўная ацэнка павінна па часе апераджаць выніковую. Калі настаўнік сапраўды імкнецца павысіць матывацыю вучняў і якасць іх адукацыі, ён не можа абысціся без дамінавання актыўнай ацэнкі.

Алена РАДЗЕВІЧ:

— Безумоўна, без адзнак мы не можам абысціся. Бо інакш вучні не будуць ведаць ступень валодання тымі ці іншымі ведамі і ўменнямі. Падсумоўваючая ацэнка заклікана зафіксаваць узровень засваення канкрэтнай тэмы. Ацэнка, выражаная у балах, дае вучню толькі інфармацыю пра тое, наколькі яго праца блізкая або далёкая ад ідэальнай. Атрымаўшы адзнаку ў балах, вучань можа толькі фіксаваць яе наяўнасць, але не мець магчымасці палепшыць.

Толькі ўявіце сабе сітуацыю: вучань дапусціў у дыктоўцы 20 памылак. Ён працаваў над сабой і ў наступную спробу дапусціў ужо 10 памылак. У балах ён атрымае адну і тую ж адзнаку. І толькі ў сваім каментарыі настаўнік зможа ацаніць здзейсненую дзіцём гіганцкую працу, яго рух наперад...

Знайсці агульную мову

«ЗВЯЗДА»: ***— А як можна пераканаць бацькоў і зрабіць іх сваімі саюзнікамі? Усё ж такі стэрэатыпы, звязаныя з адзнакай, складаліся дзесяцігоддзямі...***

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Многія школьныя навацыі дрэнна ўспрымаюцца бацькамі, паколькі іх так не вучылі, а школа не лічыць патрэбным весці растлумачальную работу.

Недастаткова проста папрасіць бацькоў, каб тыя адмовіліся ад пытання «Што ты сёння атрымаў» (а гэта, насамрэч, важна, каб дзеці не думалі, што ў школу яны ходзяць па адзнакі). Узамен трэба прапанаваць бацькам спіс іншых пытанняў, напрыклад «Чаму ты сёння навучыўся?», «Што для цябе было нечаканым?», «У чым ты сабой задаволены?», «Калі б можна было паўтарыць сённяшні твой школьны дзень, што б ты зрабіў інакш?»...

Можна паказаць на экране на бацькоўскім сходзе дзве працы вучняў: у першай — выпраўленыя памылкі і пастаўлена адзнака, а ў другой — настаўнікам дадзены каментарый па «НаШтоБуЗу» — наконт моцных бакоў і прабелаў у рабоце. Спытайцеся, што і чаму ім больш спадабалася? Так яны ўбачаць, што актыўная ацэнка дапамагае іх дзіцяці лепш вучыцца, і не будуць злавацца на тое, што яны не заўсёды прыносяць са школы адзнакі.

Святлана ЛОКІС:

— З бацькамі вучняў у мяне заўсёды складваюцца добрыя адносіны, я ніколі не адмаўляла ім у стасунках. Паставіўшы бацькоў у пазіцыю вучня, імкнуся аднавіць для іх тую сітуацыю і ўнутраныя перажыванні, якія яны адчувалі, калі былі такімі ж вучнямі. Прымушаю бацькоў паглядзець на праблемы дзяцей больш глыбока, каб яшчэ раз пераканацца ў тым, што патрабаваць прасцей, чым адпавядаць чужым стандартам. Паглядзеўшы ў «люстэрка», прасцей зразумець наша бацькоўскае «эга». На прыкладах распавядаю, што вялікую дапамогу ў «камфортным навучанні» нам можа аказаць методыка актыўнай ацэнкі.

Святлана ПАЛЯНСКАЯ:

— У пачатковай школе нам было вучыцца прасцей, тым больш што з настаўніцай маёй дачцэ моцна пашанцавала. А ў пятым класе настаўнікаў стала шмат. І мне ўжо складана трымаць руку на пульсе. Калі дзіця не разумее, што ад яго патрабуецца, а настаўнік не хоча яму патлумачыць, як мне кампетэнтна дзейнічаць у гэтай сітуацыі? Для прыкладу, у пачатковай школе дзяцей вучылі пісаць чыста, а цяпер настаўніца дазваляе браць чырвоны аловак і выпраўляць свае памылкі. У мяне пытанняў вельмі шмат. Мяне асабіста не трэба пераконваць у эфектыўнасці актыўнай ацэнкі. Лепш скажыце, што трэба зрабіць, каб яе ўкаранілі ў нашай школе?

Даць каментарый ці запоўніць паперкі?

«ЗВЯЗДА»: ***А як і дзе можна авалодаць методыкай актыўнай ацэнкі? Ці магчыма зрабіць гэта самастойна? Вы дапускаеце рызыку, што некаторыя з настаўнікаў пачнуць фармальна падыходзіць да актыўнай ацэнкі і дыскрэдытуюць яе? І ўвогуле, ці ўсе могуць авалодаць новым светапоглядам?***

Святлана ЛОКІС:

— Адзін з амерыканскіх педагогаў сказаў, што сучасны настаўнік — натхняльнік перамен. Але для таго, каб адбыліся змены ў школе, трэба, каб сам настаўнік пажадаў змяніцца. Актыўная ацэнка вымагае ад педагога на кожным уроку даваць змястоўную ацэнку рабоце кожнага вучня, каб той зразумеў, чаму ён навучыўся. А гэта сур'ёзная праца... Трэба пазбавіць настаўніка мітусні. Пра што мы сёння думаем, чым заклапочаны? Зусім не тым, каб забяспечыць з вучнем зваротную сувязь, а каб у нас усё было аформлена правільна. Вучэбны працэс адышоў за паперкамі, планамі і справаздачамі на дзясяты план.

Святлана ПАЛЯНСКАЯ:

— А каму патрэбныя ўсе гэтыя паперкі? Маёй дачцэ яны непатрэбныя...

Алена ПАЛЕЙКА:

— Як ментар дыстанцыйных курсаў ТБШ па актыўнай ацэнцы адзначу, што нашы педагогі часта наракаюць на вялікую загружанасць, што іх пастаянна кантралююць і дробязна рэгламентуюць, што і як яны павінны рабіць.

Тамара МАЦКЕВІЧ:

— Першыя пазіцыі ў Еўропе па даследаваннях PISA займаюць Фінляндыя, Нідэрланды, Польшча, Эстонія. І ва ўсіх гэтых краінах шырока выкарыстоўваецца метад актыўнай ацэнкі. Беларускія педагогі ўпершыню змаглі пазнаёміцца з актыўнай ацэнкай у 2009 годзе на сумесных беларуска-польскіх семінарах. А сёння ёсць як мінімум тры спосабы, каб авалодаць актыўнай ацэнкай. Кожную восень Таварыства беларускай школы набірае ахвотных на шасцімесячны дыстанцыйны курс па актыўнай ацэнцы. Але попыт перавышае нашы магчымасці. Мяркуем, што набяром 60 чалавек, а набіраем 90. Першыя нашы выпускнікі ўжо працуюць на курсах ментарамі і навучаюць актыўнай ацэнцы іншых настаўнікаў. За чатыры гады сфарміраваўся «залаты фонд» педагогаў з новым мысленнем.

Калі педагог дае магчымасць памыляцца, істотна змяняюцца паводзіны вучня, яны смялей пачынаюць выказвацца, дзяліцца цікавымі ідэямі, задаваць пытанні, агучваць гіпотэзы.

Да таго ж Цэнтр прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі рэгулярна праводзіць семінар «Актыўная ацэнка як новая стратэгія навучання». На семінары працуюць выкладчыкі і педагогі, якія былі на стажыроўцы і выступаюць у ролі ментараў на дыстанцыйным навучанні. Плюс педагогі-практыкі ладзяць рэгіянальныя семінары, працуюць з маладымі настаўнікамі.

Дзейнічае інтэрнэт-сайт актыўнай ацэнкі (http://aacenka.by), дзе, напрыклад, бясплатна можна спампаваць кнігу «Актыўная ацэнка ў дзеянні», знайсці прыклады ўрокаў.

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Мушу канстатаваць, што не кожны настаўнік здольны прыняць філасофію актыўнай ацэнкі, якая ставіць у цэнтр урока вучня з яго патрэбамі. Многім педагогам цяжка адмовіцца ад стэрэатыпаў, якія складваліся дзесяцігоддзямі. Што мы сёння нярэдка называем? Нехта спяшаецца абагульніць свой вопыт па актыўнай ацэнцы, хоць даведаўся пра яе годдва назад. Нехта заяўляе адкрыты ўрок па актыўнай ацэнцы, а потым дэманструе нейкую пародыю... Таму мы раім настаўнікам, якіх напружваюць праблемы традыцыйнага навучання, якія ўбачылі магутны патэнцыял актыўнай ацэнкі: вучыцеся, чытайце, камунікуйце з калегамі, спрабуйце, заваёўвайце аднадумцаў — і поспех да вас абавязкова прыйдзе.

«Круглы стол» правяла Надзея НІКАЛАЕВА.

nikalaeva@zviazda.by

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Поўны тэкст «круглага стала» можна знайсці на сайце www.zviazda.by

ХРЫСТУС УВАСКРОС, І ЁН З НАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мы толькі можам уявіць сабе стан тых жанчын! Яны былі перапалоханы ўбачаным і пачутым. І гэта не дзіўна. Тое ж самае было б з намі, калі б мы трапілі ў падобную сітуацыю.

Хоць і перапужаныя, яны, аднак, дзеляцца гэтай радасцю з апосталамі. Пётр і Ян імгненна бягуць да магілы, каб пацвердзіць факт уваскрэсення Езуса і паверыць.

Гэты храналагічны евангельскі аповед з'яўляецца фундаментальным для нашай веры. Ён кардынальна змяніў жыццё апосталаў і таксама павінен змяняць наша жыццё, бо мы не адны і з намі ўваскрослы Езус — наша надзея.

Ён уваскрос! Ніхто і ніколі не мог сказаць больш падбадзёрваючых слоў, чым гэтыя. Уваскрэсенне Хрыста — гэта дзень, які Пан учыніў, і падзея, у якой мы з радасцю ўдзельнічаем.

Мы завяршылі Вялікі пост — час нашага духоўнага ўваскрэсення. У духоўнай вандроўцы разам з церпячым Езусам мы прыйшлі да сённяшняга радаснага дня. У Вялікую пятніцу мы перажывалі драму Кальварыі. Сын Божы добравольна аддаў сваё жыццё за нас, каб выбавіць з улады злога духа і палону граху. Нявінны аддаў сваё жыццё за вінаватых і грэшных. Ці можа быць большая любоў?

Дзякуючы Пасхальнай таямніцы, крыж як дрэва ганьбы і нечалавечых цярпенняў перамяніўся ў знак перамогі, любові і надзеі. Укрыжаваны Езус прыгадвае нам аб Божай любові і Яго бязмежнай міласэрнасці, якая праявілася ў Яго збаўчай смерці і ўваскрэсенні. Збаўчы акт Хрыста змяшчае адначасова Крыж і Уваскрэсенне.

Пасхальная таямніца смерці і ўваскрасення Хрыста адкрывае нам схаваную праўду пра Бога. Здаецца, што Крыж на Кальварыі закрывае Яго магчымасці. Але на самай справе крыжовая смерць Езуса — гэта не канец, але пачатак. Гэта толькі пункт часовага затрымання, як быццам аўтобусны прыпынак. Як пасля прыпынку аўтобус едзе далей, таксама і Хрыстус сваёй боскай моцай не спыняецца і працягвае дзейнічаць.

Калі Вялікая пятніца была чалавечым «НЕ» Богу, то велікодны ранак стаў Божым «ТАК» чалавеку. Чалавек створаны не для смерці, але для жыцця, якое атрымаў дзякуючы Пасхальнай таямніцы. Велікодная раніца пацвердзіла ўсёмагутнасць Бога і тое, што Ён, а не хтосьці іншы, нават самы моцны гэтага свету, з'яўляецца яго Валадаром.

Сёння з верай мы павінны прыняць праўду аб тым, што дрэва ганьбы сталася дрэвам бязмежнай любові Бога да чалавека. Больш за тое, Ён заўсёды ёсць з намі. З намі ёсць Бог Любові, які так палюбіў свет, што аддаў свайго Сына, каб нас збавіць. Таму слова «любоў» з'яўляецца ключавым словам Пасхальнай таямніцы. На яе мы пакліканы адказаць падобнай любоўю, якая павінна праяўляцца ў нашых адносінах да Бога і бліжняга.

Гэта любоў ужо 2 тысячы гадоў фарміруе Божы народ і вядзе яго шляхам збаўлення. Гэта тая самая любоў, якая аберагае і ўмацоўвае нашу веру. Касцёл абапіраецца на гэтую Божую любоў, каб паспяхова выконваць сваю місію і найперш абвяшчаць Бога, імя якога «міласэрнасць», як кажа Папа Францішак.

У эйфарыі сённяшняга свята мы не можам забыцца аб праблемах, з якімі сустракаецца сёння Касцёл і хрысціянская вера наогул. Гэта найперш фізічны пераслед, асабліва на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы. Там, у калысцы нашай веры, вызнаўцы Хрыста штодзённа плацяць сваім жыццём або павінны пакідаць родныя мясціны толькі таму, што такімі з'яўляюцца.

У многіх краінах свету прымаюцца законы, якія супярэчаць Божаму закону, і само хрысціянства высмейваецца. Людзі не прымаюць удзел у набажэнствах, не моляцца, не захоўваюць Божыя запаведзі і г.д. З'яўляецца ўсё больш абыякавых, намінальных хрысціян, якіх на самай справе нічога, акрамя пасведчання аб хросце, не злучае з Касцёлам. Хрысціянскія ўрачыстасці і трыдыцыі для многіх становяцца як быццам фальклорам і нагодай добра правесці час без усведамлення іх глыбокага рэлігійнага сэнсу. У Еўропе ўжо ёсць краіны, дзе праблемай становіцца крыж на шыі веруючага ці на адзенні на месцы працы. Гэта не што іншае, як праяўленне дэхрысціянізацыі і дэсакралізацыі нашага жыцця. Губляецца сапраўдны сэнс хрысціянства, і яно знаходзіцца ў вялікай небяспецы ў сучасным свеце, які з касмічнай хуткасцю секулярызуецца.

Гістарычна хрысціянская Еўропа ўсё часцей добравольна адмаўляецца ад сваёй хрысціянскай спадчыны і каранёў і становіцца постхрысціянскай. А калі і ўспамінае аб хрысціянстве, то без аднясення да канкрэтнай веры ў Хрыста і захавання хрысціянскіх каштоўнасцяў. Наш кантынент становіцца шматкультурным, так што нават у штодзённы абыход увайшоў тэрмін мульці-кульці-грамадства без ясна выражанай рэлігійнай прыналежнасці.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На гэтую праблему і вынікаючую з яе духоўную і сацыяльную небяспеку звярнулі ўвагу Папа Францішак і Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл у падпісанай сумеснай заяве падчас гістарычнай сустрэчы, якая мела месца 12 лютага 2016 года ў Гаване на Кубе. Яны выказалі сваю занепакоенасць сітуацыяй, калі ў многіх краінах свету хрысціяне сустракаюцца з абмежаваннем рэлігійнай свабоды і правам сведчыць аб сваіх рэлігійных перакананнях і жыць паводле іх.

Яны таксама падкрэслілі, што палітыка секулярызацыі вядзе да небяспекі ў галіне свабоды веравызнання. Некаторыя палітычныя сілы, кіруючыся ідэалогіяй секулярызму, які нярэдка прымае агрэсіўныя формы, імкнуцца выцесніць хрысціянства на перыферыю грамадскага жыцця. У той жа час еўрапейская інтэграцыя павінна паважаць рэлігійную тоеснасць сваіх грамадзян. Будучы адкрытай на іншыя рэлігіі, Еўропа, тым не менш, павінна заставацца вернай сваім хрысціянскім караням і захаваць сваю хрысціянскую душу.

Вельмі часта ў сваім духоўным жыцці мы кіруемся ідэямі паліткарэктнасці ў галіне рэлігіі і свабоды веравызнання і робім усё, каб толькі спадабацца людзям з іншымі, нават секулярнымі, перакананнямі, забываючыся пры гэтым пра свае. Зразумела, што трэба з пашанай ставіцца да перакананняў іншых людзей. Але ў той жа час нам, хрысціянам, нельга страціць сваёй хрысціянскай тоеснасці і недапушчальна не бараніць хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Пазіцыя абыякавасці і індыферэнтнасці адносна нашай веры і захавання прынцыпаў Евангелля — гэта не што іншае, як балючы нарыў на целе сучаснага хрысціянства. Яго неабходна як мага хутчэй аперыраваць, каб не пачалася духоўная гангрэна і не атруціўся ўвесь арганізм.

Калі мы сцвярджаем, што з'яўляемся хрысціянамі, то павінны змагацца за нашу веру і яе сведчыць у штодзённым жыцці. Мы павінны таксама будаваць масты паміж рознымі хрысціянскімі веравызнаннямі, каб сумесна сведчыць Евангелле, яго бараніць і абвяшчаць. Нам неабходна весці дыялог з нехрысціянскімі рэлігіямі, каб разам вырашаць узнікаючыя праблемы, бо існуючыя розніцы ва ўспрыманні рэлігійных ісцін не павінны перашкаджаць людзям розных веравызнанняў жыць у міры і згодзе.

Падчас доўгіх дзесяцігоддзяў ганенняў на веру наш народ заплаціў высокую цану за свабоду веравызнання. Гэта вялікі дар Божай міласэрнасці, прадказаны Марыяй у Фаціме ў далёкім 1917 годзе. Але гэта таксама вялікае і адказнае заданне — не дапусціць размывання гэтага дару ў мутнай вадзе секулярызму і не страціць яго. Таму мы павінны мужна супрацьстаяць усялякім праяўленням спакусаў рэлігійнай палітказрэктнасці, якія аслабляюць і нішчаць нашу веру, каб крочыць за ўваскрослым Хрыстом у марафоне нашага жыцця.

Ва ўсіх яго абставінах мы павінны заставацца вернымі нашаму хрысціянскаму пакліканню, якое бярэ свой пачатак у сакрамэнце хросту, што з'яўляецца маркерам нашай хрысціянскай тоеснасці. Менавіта ім пазначаны тыя, хто ідзе шляхам Хрыста, гэта азначае тыя, хто памёр для граху і ўваскрос для новага духоўнага жыцця. Гэтым духоўным маркерам пазначаны кожны хрысціянін, які ў сакрамэнце хросту ўключыўся ў Хрыста і прабывае з намі ў служэнні Касцёла.

Уваскрэсенне Езуса ёсць знакам уваходу ўваскрослага Бога ў наша жыццё і Яго радыкальнага дзеяння ў свеце. Уваскрослы Хрыстус аб'яўляе нам прыроду і логіку не суду, але Божай міласэрнасці. Ён як быццам прамаўляе да нас: «Паглядзі, чалавек, ты забіў Мяне, але Я прыходжу да цябе з пасланнем міру, бо хачу, каб ты разам са Мною вярнуўся да жыцця».

Таму вызнаўцы Хрыста павінны адзначацца згодным з Яго вучэннем жыццём. Гэта азначае, што наш позірк павінен быць скіраваны не на нас саміх і на нашы індывідуальныя справы, але на Божыя. Ён таксама павінен быць скіраваны на духоўныя і матэрыяльныя патрэбы іншых, як да гэтага заклікае Папа Францішак у Юбілейным Годзе Божай Міласэрнасці.

Свята Пасхі — гэта магутнае «ТАК» Бога для дабра чалавека. Гэта надзея, нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія сёння перажывае хрысціянства і свет. Гэта дар для ўсяго чалавецтва, што ў Хрысце смерць перамяняецца ў жыццё. Таму разам з анёламі мы павінны казаць: «Езуса няма ў магіле. Ён уваскрос і ёсць сярод нас!»

Пасля трох пакаленняў ганенняў і праследу Каталіцкі Касцёл у Беларусі перажывае сваю Пасху. У гэтым Юбілейным Годзе Божай Міласэрнасці мы адзначаем сярэбраны юбілей адраджэння касцёльных структур і ўстанаўлення св. Янам Паўлам II Мінска-Магілёўскай мітраполіі. Галоўныя ўрачыстасці адбудуцца ў Будславе 1-2 ліпеня гг.

Сёлетні пастырскі дэвіз «Надзея ў Божай міласэрнасці» ўключае ў сябе падрыхтоўку да гэтага юбілею. Яе складнікам з'яўляюцца пастырскія візітацыі з мэтай падсумавання дасягненняў і пошуку шляхоў удасканалення.

Адраджэнне структур Каталіцкага Касцёла ў Беларусі і яго развіццё яшчэ раз пацвярджае праўду Уваскрэсення Хрыста. Езус, якога цягам трох пакаленняў атэістычныя сілы на нашай зямлі спіхвалі ў магілу і хацелі пахаваць, уваскрос і ўваходзіць у наша жыццё. Ён жыве, Ён з намі, і з Ім жыве Беларусь.

Дарагія браты і сёстры! Віншую ўсіх вас з радасным і збаўчым святам Пасхі Хрыстовай!

Няхай уваскрослы Езус будзе крыніцай нашага жыцця, каб з вечна жывой Пасхальнай таямніцы мы чэрпалі духоўныя сілы, былі мужнымі сведкамі і місіянерамі хрысціянскай веры.

Складаю свае найлепшыя святочныя пажаданні хрысціянам іншых канфесій, якія сёння разам з намі адзначаюць гэтае свята святаў.

Віншую праваслаўных братоў і сясцёр. Жадаю ім поспеху ў духоўнай падрыхтоўцы да святаў Пасхі, радасць якой мы будзем раздзяляць разам з вамі, каб, умацаваныя ласкай Пасхальнай таямніцы, мы маглі плённа супрацоўнічаць у галіне абвяшчэння і абароны хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Віншую ўсіх людзей добрай волі! Езус збавіў усіх людзей, і ў Ім наша надзея.

Радаснай, поўнай ласкі ўваскрослага Пана, свята Пасхі Хрыстовай і Яго супакою!

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос! І Ён з намі!

Раздзяляючы разам з усімі вамі ласку пасхальнай падзеі, свае пажаданні ўмацоўваю благаслаўленнем у імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

Открытое акционерное общество
«Стройтрест №7»

Учетный номер плательщика: **100512859**
Вид экономической деятельности: **строительство**
Организационно-правовая форма: **открытое акционерное общество**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220005, г. Минск, пр. Машерова, 16**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2015 года	На 31 декабря 2014 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	84 296	75 157
Нематериальные активы	120	29	43
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	127	39
Долгосрочные финансовые вложения	150	571	585
Отложенные налоговые активы	160		-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	1 111	1 168
Прочие долгосрочные активы	180		-
ИТОГО по разделу I	**190**	**86 134**	**76 992**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	113 605	97 740
В том числе: материалы	211	105 069	90 831
животные на выращивании и откорме	212		-
незавершенное производство	213	8 003	6 700
готовая продукция и товары	214	533	209
товары отгруженные	215		-
прочие запасы	216		-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		-
Расходы будущих периодов	230	4 128	1 403
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	763	755
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	467 722	474 320
Краткосрочные финансовые вложения	260		-
Денежные средства и их эквиваленты	270	39 497	51 921
Прочие краткосрочные активы	280	72 188	19 654
ИТОГО по разделу II	**290**	**697 903**	**645 793**
БАЛАНС	**300**	**784 037**	**722 785**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2015 года	На 31 декабря 2014 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	129	129
Неоплаченная часть уставного капитала	420		-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		-
Резервный капитал	440		-
Добавочный капитал	450	56 330	51 319
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	117 189	133 984
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	11	237
ИТОГО по разделу III	**490**	**173 659**	**185 669**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	35 083	2 950
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**35 083**	**2 950**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	39 305	34 078
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	463 788	480 424
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	404 886	372 274
по авансам полученным	632	13 868	53 542
по налогам и сборам	633	11 684	15 395
по социальному страхованию и обеспечению	634	5 311	8 716
по оплате труда	635	18 098	26 099
по лизинговым платежам	636	225	23
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637		-
прочим кредиторам	638	9 716	4 375
Обязательства, предназначенные для реализации	640		-
Доходы будущих периодов	650	14	10
Резервы предстоящих платежей	660		-
Прочие краткосрочные обязательства	670	72 188	19 654
ИТОГО по разделу V	**690**	**575 295**	**534 166**
БАЛАНС	**700**	**784 037**	**722 785**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2015 года	За январь–декабрь 2014 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	1 285 985	1 178 916
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(1 060 796)	(852 592)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	225 189	326 324
Управленческие расходы	040	(175 581)	(162 902)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	49 608	163 422
Прочие доходы по текущей деятельности	070	96 378	75 862
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(124 158)	(100 305)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	21 828	138 979
Доходы по инвестиционной деятельности	100	500	535
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	224	264
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	6	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	270	271
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(196)	(736)
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(66)	(71)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(130)	(665)
Доходы по финансовой деятельности	120	3 873	6 206
В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	3	
прочие доходы по финансовой деятельности	122	3 870	6 206
Расходы по финансовой деятельности	130	(7 589)	(5 480)
В том числе: проценты к уплате	131	(1 561)	
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(132)	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(5 896)	(5 480)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	(3 412)	525
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	18 416	139 504
Налог на прибыль	160	(11 633)	(30 294)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	(28)	(2)
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200)	210	6 755	109 208
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	4 912	4 023
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	11 667	113 231
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель Б.М. Шерман
Главный бухгалтер С.В. Рапинчук

КАБ НЕ ДЗІРКА Ў РОЦЕ, ХАДЗІЎ БЫ Ў ЗЛОЦЕ

Пасля доўгай паўзы журналісты-«эканамісты» нашага выдання аднаўляюць дыскусіі па розных жыццёвых сітуацыях, дзе ў якасці аргументаў прымаюцца не толькі меркаванні бакоў, але і фінансавыя разлікі. Цяпер на звяздоўскай «кухні» адбыліся кадравыя змены. Гэтым разам апанентам лысаватага, але даволі эканомнага дзядзькі — Сяргея Куркача — выступае поўны сіл і энергіі 25-гадовы карэспандэнт — Ілья Крыжэвіч. Менавіта гэты юнак на працягу трох месяцаў не есць мяса і пры гэтым упэўнены, што за такі час ён у вазе і энергіі нічога не страціў і нават пэўныя грошы сэканоміў. Са свайго боку спадар Куркач, які на працягу жыцця бачыў шмат прыхільнікаў розных дыет: ад сыраедаў да тых, хто лічыць сябе веганамі (толькі раслінная ежа), упэўнены ў адваротным.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЯК НЯМА МЯСА, ТО І ГРЫБ ЗАКРАСА

Сяргей Куркач — Дзіўны ты хлопец, Ілья! Ты ж малады, сяброў, мабыць, шмат, а з імі — на шашлыкі. Гэта ж цудоўна! А без мяса — ты «батанам» станеш! Будзеш потым на перакладзіне вісець, як гліст. Мужыку энергія патрэбна, а яна якраз у мясе і ёсць.

Ілья Крыжэвіч — З шашлыкамі разам гарэлачка п'ецца, а я, наколькі вы ведаеце, падобны напой увогуле не ўжываю. З турніком не мяса ў пузе ў якасці ежы сябруе, а мазалі на руках і сіла волі. І наконт энергіі — пытанне даволі спрэчнае.

Я якраз ад мяса і адмовіўся, бо гэта цяжкі для чалавека прадукт, які засвойваецца складаней, чым раслінная ежа. Каб атрымаць энергію, кожнаму ў рацыёне неабходны бялкі, тлушчы, амінакіслоты і вугляводы, але мала хто ведае, што знайсці іх можна не толькі ў прадуктах жывёльнага паходжання. Так, у нас лічыцца, што мяса з'яўляецца асноўным пастаўшчыком бялкоў, якія «выбудоўваюць» арганізм. Але бялкі ёсць таксама і ў расліннай ежы, напрыклад, у бабовых культурах.

С.К. — Дзякуй табе, хлопча, за лекцыю. Ты мне лепш растлумач, якім чынам — мехам капусты ці нейкай іншай «травой» — будзеш гэты набор амінакіслот і бялкоў замяшчаць? Такую замену падабраць можна, але новы спіс прадуктаў, мне здаецца, яшчэ тую капейку каштаваць будзе.

І.К. — Заблыталіся вы нешта, Сяргей Андрэевіч. Я вам не веган, які-небудзь — не ем толькі мяса і рыбу. А малако, тварог, смятану — ужываю. Гэта не адбіваецца на маім бюджэце адмоўна, наадварот, на некаторых пазіцыях я нават эканомлю.

С.К. — Ага, цяпер мне яшчэ скажы, што ў цябе бабуля ў лесе жыве, таму замест мяса выключна грыбы і ясі. Шчыры беларус з цябе атрымліваецца, якому калі няма мяса, то і грыб закраса. А, можа, у гэтым лесе ты і арэхі розныя мяхамі збіраеш?

І.К. — Не, сваякоў у лесе ў мяне няма, а вось грыбы і арэхі я сапраўды люблю. Гэта вельмі карысна для арганізма. Напрыклад, у грыбах выяўлена 18 амінакіслот, восем з якіх з'яўляюцца незаменнымі, бо не могуць утварацца ў чалавечым арганізме і паступаюць сюды толькі з ежай. А арэхі разам з мясам і рыбай уваходзяць у групу каштоўных крыніц бялку.

С.К. — Здымаю капялюш за лекцыю № 2 — пра здаровую ежу, спадар Крыжэвіч. Ну а цяпер давай падлічым, колькі гэтыя далікатэсы каштаваць будуць.

ШЫРОКАЯ ЛЫЖКА РОТ ДЗЯРЭ

І.К. — Папярэдне перад адмаўленнем ад мяса я падлічыў, колькі майму арганізму патрэбна бялку. Пасля чаго склаў прыкладны спіс прадуктаў на дзень і на месяц. Удзень мне неабходна з'есці 4 яйкі, 250 грамаў бабовых, пачак тварагу (200 г), цвёрдага сыру 150 грамаў, паўлітра малака. Калі перавесці гэты спіс на грошы, то ў месяц з маёй кішэні знікае прыблізна 1,4-1,5 млн рублёў на бялок.

С.К. — Ну і што? Ты на гэтым кропку паставіў? А дзе твае грыбы і арэхі? Вырашыў ад мяса адмовіцца — будзь ласкавы, ужывай каля двух кілаграмаў свежых грыбоў у месяц. У нашым выпадку гэта будуць шампіньёны па 50 тысяч за кіло. Нават па мінімуме табе спатрэбіцца яшчэ каля кілаграма вылушчаных грэцкіх арэхаў (350 тысяч рублёў), па 300 грамаў фісташак і міндалю, што ў суме пацягне яшчэ на 220 тысяч рублёў. Прыплюсуй да сваёй сумы гэтыя 670 тысяч абавязкова.

І.К. — Ды вы гурман, спадар Куркач. Я так шмат грыбоў не ем. Ды і пра арэхі накшталт фісташак часам забываюся, бо яны, вядома, смачныя, але каштуюць... Я лепш пару кіло арахісу куплю па 70 тысяч за кілаграм.

С.К. — Сумніўная замена. У маёй сям'і дзеткі і рыбу, і мяса ядуць, але яны за месяц каля кілаграма грэцкіх арэхаў у якасці дэсерту ўжываюць. Дарэчы, пра рыбу мы забыліся. Фосфар ты адкуль бярэш? Ды і ёд табе патрэбны.

І.К. — Фосфару хапае ў яечным жаўтку, тварагу і сыры. А ёд можна знайсці перш за ўсё ў марской капусце. Не больш за 300 грамаў такой капусты мне будзе дастаткова на тыдзень. Таму ў месяц на яе аддаю каля 60 тысяч рублёў. Дарэчы, дзякуй, што нагадалі, буду больш есці гэтых прадуктаў.

С.К. — Цяпер дакладна падаб'ём кошт тваёй мяса-рыбнай замены. Плюсуем твае паўтара мільёна да 670 тысяч на арэхі і 60 тысяч на капусту. Во, згадзіся, цікавы сказ атрымаўся, нібыта рацыён разглядаем для «элітнай кароўкі». Ты тут моцна не крыўдуй. Твая замена пацягнула на 2,2 млн рублёў. Ну а цяпер давай падлічым, колькі мае рыба і мяса каштаваць будуць. Мяса я купляю на сям'ю з пяці чалавек двойчы ў месяц, а рыбу — штотыднёва. Для катлет звычайна бяру свініну, дзе 60% кумпяк на костцы і 40% сырога шпіку. Такі кумпяк сёння можна знайсці ў асобных крамах за 50 тысяч рублёў (па акцыі), а шпік — па 20 тысяч за кіло. У катлеты дабаўляю і іншыя інгрэдыенты, але мясны сабекошт іх будзе складаць недзе каля 35 тысяч рублёў за кг. У месяц такім чынам мая сям'я «топча» каля 5-6 кг свініны.

Адбіўныя мы робім з курынай грудкі. Іх на месяц таксама 5-6 кг трэба. А каштаваць яны будуць каля 45 тысяч рублёў за кіло (таксама на акцыі). Вось і атрымліваецца, што на мяса мая сям'я аддае каля 600 тысяч рублёў.

І.К. — А ці не зарана вы падлік ужо зрабілі? А дзе рыба і каўбасы?

С.К. — Астынь, хлопча, я свой калькулятар яшчэ не зачахляў. З марской рыбы мы бяром скумбрыю і мінтая, дзе кіло каштуе 40-45 тысяч рублёў. Купляем у месяц па 3 кг кожнай. Сюды запісваем і 3 кг філе пангасіуса па 55-60 тысяч рублёў за кіло. На рыбу выходзіць 450 тысяч рублёў. Прыплюсуем сюды 200 тысяч на сёмгу, якую я дома самастойна салю для дзетак, і 100 тысяч на салёны селядзец для салатаў пад шубай. Будзе 750 тысяч на рыбу і 600 тысяч на мяса. Цяпер усяго атрымліваем 1,35 млн рублёў. Аднак без каўбас таксама не абыходзімся. Для бутэрбродаў дзецям у школу купляем сыравэнджаную і паўсухую каўбасу прыкладна па 140 тысяч рублёў за кіло. Тут у месяц 280 тысяч будзе. Яшчэ прыклада 200 тысяч аддаём на вараную каўбасу. Вось цяпер усё — 1,83 млн рублёў у месяц на пяць чалавек. Можа што забыўся па дробязі — прабачце.

РЭЦЭПТ АРЫГІНАЛЬНЫХ КАТЛЕТ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ АД КУРКАЧА

Склад: *600 грамаў свініны, 200 грамаў шпіку, 300 грамаў курынай грудкі, 150 грамаў белага хлеба і 100 грамаў малака, дзве сярэднія цыбуліны і 5-6 зубкоў часнаку, 200 грамаў 20%-й смятаны, соль на смак.* Свініну, шпік і цыбулю двойчы круцім праз мясарубку. Размінаем часнок і заліваем вадою (100 грамаў). Сухі белы хлеб кладзём у малако. Бяром часночную ваду і ўсе астатнія інгрэдыенты і яшчэ раз круцім мясарубкай. Хуценька абсмажваем з двух бакоў на патэльні. Канчаткова даводзім у разагрэтай духоўцы на працягу 20 хвілін.

ХТО ПЕРАБІРАЕ — З ГОЛАДУ ПАМІРАЕ

І.К. — А вы хітрун. Да маіх бялкоў дадалі самыя дарагія арэхі і амаль вядро грыбоў з магазіна. А самі дзецям малака і тварагу пашкадавалі.

С.К. — Малако мы п'ём літрамі, а смятану ўжываем лыжкамі. Але гэта ежа ў нас не замяняе мяса, як у цябе. Мы малако не п'ём бітонамі, як ты, а яйкі не жуём кошыкамі. Нам любая свежазгатаваная ежа падабаецца. Ды і арэхі мы любім усялякія. Увогуле меню нашай сям'і больш разнастайнае за кошт мяса і рыбы. А калі ты са свайго спіса харчовых прадуктаў гэтыя сур'ёзныя радкі выкрасліў, тады іх неабходна нечым іншым кампенсаваць. І па грашах такая замена каштуе нават больш. Я дзесьці чуў, што тым, хто адмаўляецца ад мяса, трэба ў рацыён абавязкова ўводзіць авакада. Там даволі шмат калію, натрыю, кальцыю, фосфару, марганцу, магнію і іншых мінеральных рэчываў. Авакада канцэнтруе памяць, зніжае рызыку ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў, і ўсё гэта дзякуючы поліненасычаным кіслотам, якія ўваходзяць у яго склад. Менавіта таму гэты плод папулярны ў вегетарыянскай кухні, дзе выкарыстоўваецца для вегетарыянскіх сушы, а таксама як альтэрнатыва яйкам і мясу. Праўда, і каштуе гэты заморскі цуд нятанна — больш за 100 тысяч рублёў кіло.

І.К. — Не жадаю я вашага авакада. Яно як мыла на смак.

С.К. — А у тваім выпадку, з рацыёнам без мяса і рыбы, перабіраць не вельмі разумным будзе. Выключна яйкамі і гарохам мяса замясціць цалкам не атрымаецца. Гэта маё ўласнае меркаванне, як бацькі траіх дзетак. А ўвогуле мне здаецца, што падобная безмясная дыета апрыёры таннай быць не можа. Ты паспрабуй у рэстаране спецыяльны вегетарыянскі абед заказаць...

І.К. — А, відаць, самі ўжо спрабавалі? У вашым узросце суп з морквы лепш сёрбаць, а не вялікую адбіўную ўмінаць за абедзве шчакі.

С.К. — Недзе ты часткова і маеш рацыю. На сваёй працы я сякерай не махаю і, на жаль, у «качалку», як ты, не хаджу. Таму мяса мне шмат і не трэба. Але адмаўляцца ад яго, і тым больш ад рыбы, я не збіраюся. А ў тваім выпадку гэта быў вельмі смелы і, магчыма, не цалкам асэнсаваны крок. Не буду цябе пераконваць у адваротным, але проста параю здаць сваю кроў на аналіз. Ты вось неяк казаў, што само адчуванне ў цябе добрае і важыць менш не стаў, дык хай спецыялісты гэта пацвердзяць.

І.К. — Я вашай парадай скарыстаюся толькі ў тым выпадку, калі вы са мной пойдзеце. Тады і паглядзім, якая ў вас «чырвоненькая».

С.К. — А пайшлі. Калі ў пашпарце без года пяцьдзясят, то сваё здароўе ў прафесіяналаў правяраць трэба, а не толькі на «кухні».

Сяргей КУРКАЧ. *Kurkach@zviazda.by*
Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«МИНСККОНТРАКТ»
220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25, УНП 100251588

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 г. (млн руб.)

АКТИВЫ		СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	
Долгосрочные активы	**53166**	**Собственный капитал**	**68096**
в том числе:		в том числе:	
Основные средства	52146	Уставный капитал	43886
Нематериальные активы	3	Резервный капитал	255
Вложения в долгосрочные активы	53	Добавочный капитал	15497
Долгосрочные финансовые вложения	964	Нераспределенная прибыль	8458
Краткосрочные активы	**111454**	**Долгосрочные обязательства**	**204**
в том числе:		в том числе:	
Запасы	32799	долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	204
Расходы будущих периодов	2465	**Краткосрочные обязательства**	**96320**
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	41	в том числе:	
Краткосрочная дебиторская задолженность	72493	Краткосрочные кредиты и займы	22682
Денежные средства и их эквиваленты	2864	Краткосрочная кредиторская задолженность	73638
Прочие краткосрочные активы	792		
БАЛАНС	**164620**	**БАЛАНС**	**164620**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2015 г.

Наименование показателей	млн руб.
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	344043
Себестоимость реализованных продукции, товаров, работ, услуг	300823
Валовая прибыль	**43220**
Расходы на реализацию	27366
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	**15854**
Прочие доходы по текущей деятельности	40884
Прочие расходы по текущей деятельности	43806
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	**12932**
Доходы по инвестиционной деятельности	*1351*
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	12
доходы от участия в уставном капитале других организаций	4
проценты к получению	1335
Расходы по инвестиционной деятельности	*18*
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	18
Доходы по финансовой деятельности	*12136*
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	12136
Расходы по финансовой деятельности	*25331*
в том числе: проценты к уплате	5943
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	19382
прочие расходы по финансовой деятельности	6
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	**11862**
Прибыль (убыток) до налогообложения	1070
Налог на прибыль	853
Изменение отложенных налоговых активов	0
Чистая прибыль (убыток)	**217**

1. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) – 54,22.
2. Количество акционеров – всего 793.
В том числе: юридических лиц – 2, физических лиц – 791.
3. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	2301	966
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	миллионов рублей	1717	709
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	9176	3850
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	рублей	9176	3850
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	271,5	278,8
Количество простых акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук	0	930

4. Среднесписочная численность работающих (человек) – **117.**
5. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **оптовая торговля.**
6. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **24 марта 2016 г.**
7. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг, утвержденный протоколом №23 на общем собрании акционеров от 26.03.2010 г.

Генеральный директор В.Л. Плавский
Главный бухгалтер И.С. Шавель

Извещение о проведении 27 апреля 2016 г. аукциона по продаже права на заключение договора аренды земельного участка сроком на 99 лет для индивидуального жилищного строительства в Клейниковском сельском Совете Брестского района Брестской области

№№ лота	Предмет аукциона	Площадь, га	Начальная стоимость, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Целевое назначение земельного участка	Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, убытки (бел. руб.)
1	Земельный участок в аг. Клейники, ул. Новая, 3 121281204601000803	0,1396	36 485 410	3 648 541	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	1. 10 677 400 – за изготовление документации и регистрацию участка; 2. оплата за объявления по актам выполненных работ

По улице Новой в аг. Клейники централизовано проходят сети газоснабжения и электроснабжения.

Аукцион будет проводиться 27.04.2016 в 15.00 по адресу: Брестский район, аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Клейниковского сельисполкома № 364100000288 в филиале № 100 БОУ АСБ «Беларусбанк», МФО 246, УНП 200177417, код платежа 4002, задатка в размере 10% от начальной стоимости, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона по актам выполненных работ.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Клейники, ул. 60 лет Октября, 2 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 21 апреля 2016 года.

Контактные телефоны: 93 41 35, 93 41 16.

В связи с утерей свидетельство о государственной регистрации частного производственно-торгового унитарного предприятия «Идеалшанс» (УНП 490628892) **считать недействительным.** УНП 191903970

Мікалай КАЗЕКА:

«Рызыка ў фрыстайле? Яна заснавана на досведзе і ведах»

Уласныя поспехі — справа часовая. Але ёсць тое, што можа надаць былым перамогам новае жыццё і, калі атрымаецца, «бяссмерце», — магчымасць навучыць іншага рабіць так, як і ты, і нават лепей. Наш сённяшні герой перавысіў гэтую планку: не выступаючы як фрыстайліст, выхаваў трох алімпійскіх чэмпіёнаў, якія ў гэтым відзе спорту заваявалі шэсць алімпійскіх медалёў. Мікалай КАЗЕКА, галоўны трэнер зборнай Беларусі па фрыстайле, чэмпіён СССР у скачках на батуце, стаяў ля вытокаў стварэння фрыстайлісцкай беларускай спартыўнай школы, якой амаль праз тыдзень споўніцца трыццаць гадоў.

Надзею, што яна будзе надалей жыць і развівацца, даюць маладыя. Напрыклад, адзін з першых выхаванцаў Мікалая Іванавіча Дзмітрый Дашчынскі, двухкратны прызёр Алімпійскіх гульняў, ужо другі год працуе трэнерам у юніёрскай камандзе, перадае здабыты шматгадовай працай неацэнны (бо занадта дарагі ў маральным эквіваленце) досвед.

Наша размова з Мікалаем Казекам прысвечана яго дню нараджэння, які адбудзецца ў хуткім часе, і юбілею стварэння фрыстайла ў Беларусі. У гутарцы сам-насам мы разам шукалі формулу поспеху для беларускага спартсмена, разважалі пра родную мову і тое, колькі сярод нашых суайчыннікаў сапраўдных чэмпіёнаў.

— Перад тым, як сустрэцца з героем інтэрв'ю, я заўжды гляджу, як пра яго адгукаюцца дзяржаўныя і недзяржаўныя СМІ. Часта меркаванні супрацьлеглыя. А вас усе без выключэння хваляць!

— Не можа такога быць! *(Смяецца.)* Наколькі я ведаю, меркаванне пра мяне неадназначнае. Але лічу, што трэба адстойваць свой пункт гледжання ў дачыненні да справы, прафесіі. Магчыма, такое меркаванне склалася таму, што мае прапановы аказваюцца слушнымі і прыносяць спартыўны вынік. І не толькі спартыўны. Напрыклад, цэнтр «Фрыстайл», адзіны ў свеце крыты комплекс для трэніровак фрыстайлістаў, выкарыстоўваецца не толькі спартсменамі, але і як аквапарк. Людзям на радасць! Вядома, гэта дзякуючы не толькі мне, але перш за ўсё перамогам нашых спартсменаў.

— Да вас я прыйшла як да трэнера трох алімпійскіх чэмпіёнаў і... педагога?

— Безумоўна. Бо перада мной стаіць задача выхаваць, выгадаваць чэмпіёна. Гэта вялікая праца, паверце. І ў той жа час, каб вучань быў сацыялізаваным, адаптаваным да жыцця ў грамадстве. Гэта заўжды праца не аднаго трэнера, а ўсяго атачэння спартсмена.

— Калі выхоўваеце іх, на што робіце стаўку?

— Калі казаць пра першае пакаленне фрыстайлістаў, якія займаліся ў мяне, то, напрыклад, Дзмітрый Дашчынскі прыйшоў разам з татам, таму працаваць з ім было прасцей. Аляксей Грышын, неверагодна апантаны спортам, вельмі захапляўся катаннем на лыжах, меў неспатольную прагу ўдасканальвацца. Ала Цупер прыйшла даволі сфарміраванай спартсменкай, пераарыентаваць і развіць тыя добрыя якасці, якія ў ёй закладзены, было складана. Праходзяць гады, пакуль зразумееш, якія варта было закрануць струны, каб падштурхнуць усіх іх на вялікі спартыўны подзвіг. Для таго, каб гэтага дасягнуць, трэба жыць са сваімі вучнямі адным жыццём.

— Значыць, адназначнага адказу не існуе?

— Вы жадаеце пачуць рэцэпт поспеху? Яго няма. Шмат што робіцца падсвядома, і часам не можаш даць сабе справаздачу, чаму дзейнічаў менавіта так. Адчуваеш, што робіш слушна. Пасля адмотваеш пэўныя моманты, згадваеш канфлікты, без якіх не абыходзіцца, і пачынаеш разумець, што калі б іх не было, то ўсё склалася б па-іншаму, і, магчыма, не так удала.

— Калі бачыце дзіця, можаце прадказаць, ці вырасце з яго фрыстайліст?

— Калі гутарка ідзе пра лыжную акрабатыку, адзін з відаў фрыстайла, то будучы спартсмен мусіць прайсці да сваёй мэты праз шмат прыступак. Перш за ўсё трэба зразумець, ці падыходзіць ён па спартыўным характары, па складзе, захопленасці да заняткаў. Тут трэба пастаянна змагацца са страхам, пераступаць цераз боязі вышыні і памылак у рухах, умець рызыкаваць. І ўсё гэта павінна быць у балансе. Рызыка мусіць быць заснаваная на досведзе і ведах. Трэнер і спартсмен шукаюць гэтую мяжу разам.

— Сярод моладзі даволі распаўсюджаная гэткая хвароба бязмэтнасці жыцця. Ці дапушчальна гэта для вашых выхаванцаў і як вы іх увогуле матывуеце?

— Далёка не кожны спартсмен можа быць узорам мэтанакіраванасці, і часам прыходзіць займацца выключна па звычцы. Такім падабаецца прыйсці «патусавацца» ў кампаніі рызыкоўных фрыстайлістаў. Маўляў, я такі як і вы. Але на тыя вяршыні, куды вы падымаецеся, не пайду — баюся. Таму толькі адзінкі дасягаюць сапраўдных не толькі знешніх, але і ўнутраных, уласных перамог. Тых, хто пойдзе далей, бачна адразу ж, калі пачынаецца непасрэдная барацьба ў вялікіх спаборніцтвах за засваенне скачкоў. Але гэта не можа быць масавай з'явай. Сусветна вядомыя футбалісты Ліянэль Месі і Крышціяну Раналду — гэта адзінкі, вакол якіх ствараюцца зорныя каманды. Наша задача — адшукаць асобу, вакол якой створыцца калектыў менавіта з чэмпіёнскай аўрай, якая з года ў год будзе перадавацца па эстафеце. І галоўнае не разбурыць гэта.

— З якой колькасці чалавек такую адзінку даводзіцца абіраць?

— З вялікай колькасці. У нас жа не набор, а адбор. Прыходзяць дзеці, здаюць іспыты, тэсты гімнастычнай, кардынацыйнай накіраванасці. Глядзім, каб па складзе былі хуткімі і спрытнымі. Пасля праходзіць дзесяць-пятнаццаць гадоў, перш чым дзіця пачынае выступаць. У гадоў 14, не раней. Калі добра займаюцца акрабатыкай і выконваюць практыкаванні на батуце, тады вучацца катацца на лыжах, і толькі пасля пачынаюць скакаць. Гэта доўгі шлях.

— Існуе стэрэатып, што спартсмен — не заўжды адукаваны чалавек. А вашы выхаванцы?

— Гэтае ўяўленне даўно састарэла. Неадукаваны спартсмен элементарна не вытрымае канкурэнцыі. Я заўжды прыводжу ў прыклад Уладзіміра Васіна, алімпійскага чэмпіёна па скачках у воду (1972). Тады быў такі час, калі за спартсменаў усе бегалі здаваць іспыты, а той толькі прыходзіў, нічога не ведаючы, і перарастаў у знакамітага «нязнайку». Васін жа прыязджаў на ўсе трэніроўкі і зборы з кіпай кніг, скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін з чырвоным дыпломам.

У маёй камандзе, як і ў любой школе, ёсць тыя, хто мае шанц, і тыя, хто адстае. Ёсць тыя, якія цікавяцца, ёсць і тыя, хто не мае імпэту да новых ведаў. Цяпер, вядома, шмат што замяніў камп'ютар, любое пытанне ўвёў у пошукавік — і за секунду атрымаў тысячы адказаў. Але ёсць і тыя, хто чытае. Напрыклад, наша Саша Раманоўская ездзіць заўжды з кніжкамі. Цяпер вывучае мову: набыла кнігу на англійскай і чытае ў арыгінале.

— Добрае параўнанне са школай, бо за трыццаць гадоў, мяркую, у вас атрымалася яе стварыць.

— Мы яшчэ працягваем гэта рабіць, пастаянна паляпшаем і дадаём у яе новае. Можна сказаць, што атрымалася, але не толькі ў мяне, а ва ўсяго калектыву.

— Важная адметнасць школы — наяўнасць пераемнасці пакаленняў. Вучні радуюць вас сваім трэнерскім талентам?

— Вядома! Асабліва з плеяды тых спартсменаў, якія толькі-толькі скончылі выступаць. Са мной працаваў Васіль Вараб'ёў, Міхаіл Курловіч, пачаў трэніраваць Дзмітрый Дашчынскі, Віталь Марцінкевіч, Дзмітрый Глушакоў, яшчэ нядаўні чэмпіён свету сярод юніёраў. Гэта маладыя людзі, якія скончылі інстытут, цяпер больш не выступаюць, хоць пакуль маюць для гэтага ўсе падставы. Але адчулі «столь» і пачалі трэніраваць.

— Вы адчуваеце сябе шматдзетным татам?

— Не! *(Смяецца.)* Сапраўды, усе яны мае выхаванцы, заўжды знаходзіліся ў полі зроку. А тое, што кожны з іх блізкі мне чалавек, дык гэта адназначна.

— Як успрымаеце іх поспехі і няўдачы?

— Не раўную да перамог, гэта 100%. Я задаволены і радуюся, калі малады трэнер знайшоў сябе, нават яго дробныя поспехі стараюся заўважыць і падтрымаць, падкрэсліць, што гэта невялікі, але крок наперад.

— А як ставіцеся да сучасных паспяховых тэхнік накшталт «візуалізацыі», калі ў думках уяўляеш усе падрабязнасці перамогі?

— Калі чалавек імкнецца да чагосьці, то ён мусіць падпарадкоўваць мэце практычна ўсяго сябе. Раз ён падпарадкоўвае сваё фізічнае, свой час, то і ў думках, падсвядома візуалізуе поспех. Напэўна, без гэтага не абыходзіцца. І я ўяўляю, як у ідэале можа зрабіць скачок.

— Вы самі не робіце элементы, але трэніруеце іншых. Як так можа быць?

«Наша задача — адшукаць асобу, вакол якой створыцца калектыў менавіта з чэмпіёнскай аўрай, якая з году ў год будзе перадавацца па эстафеце».

— Быў такі ансамбль танца Ігара Маісеева. Ён сам не танцаваў народныя танцы, а гледачы па ўсім свеце пляскалі ў ладкі яго пастаноўкам. Падобная сітуацыя была ў Надзі Каманечы. Яе трэнер, Бэла Карайі, быў валейбалістам, але зрабіў з яе вялікую гімнастку. Пасля іміграваў у Амерыку, і ў ЗША зладзіў тое ж самае: выхаваў амерыканскую каманду алімпійскіх чэмпіёнаў па гімнастыцы. Ёсць і супрацьлеглы прыклад. Некалькі гадоў таму беларускую мужчынскую зборную па біятлоне трэніраваў Рафаэль Пуарэ, адзін з самых тытулаваных французскіх спартсменаў гэтага віду спорту. Адпрацаваў у Беларусі год, пасля на чарговай кантрольнай трэніроўцы перамог усіх сваіх падапечных, сказаў, што болей перспектывы не бачыць, і з'ехаў. І сэнс, што ўмееш сам рабіць штосьці, калі навучыць не можаш?

Што тычыцца нашых трэнераў, то Дзіма Дашчынскі знаходзіцца ў прывілеяваным стане, бо ён мышачна адчуў усе скачкі, можа іх перадаць, але ці атрымаецца ў яго? Ці хопіць сіл не зацыкліцца на тым досведзе, што мае сам? Дзіма працуе трэнерам юніёрскай каманды толькі другі год, таму вынікі яшчэ пакажа час.

— Самі на лыжах стаіце?

— Так. Усё пачыналася з эксперыментальнага збору каманды Савецкага Саюза па фрыстайле. Тады, 30 гадоў таму, я ўпершыню стаў на іх. Сабраў спартсменаў з Беларусі, і мы адправіліся ўсе разам вучыцца катацца. Да гэтага не ўмеў ніхто. Былі гімнасты, скакуны ў ваду, батуцісты, акрабаты. Мне вельмі спадабалася ездзіць на лыжах. Напэўна, шмат у чым з-за гэтага прыкіпеў да фрыстайла.

— Калісьці вы казалі, што ваша праца — гэта хобі. Значыць, ніколі не працуеце?

— Я захапляюся сваёй працай, але гэта не значыць, што больш нічым не займаюся. З задавальненнем хаджу ў трэнажорную залу, басейн, апошнім часам адкрыў для сябе хадзьбу. Зараз канец сезона, і адчування, што праца — хобі, зусім не засталося. Але тое, што яна мне падабаецца — безумоўна. Я столькі часу прысвяціў гэтаму! Трэцяга красавіка, ужо на наступным тыдні, будзе 30 гадоў, як мы правялі першае мерапрыемства па фрыстайле сярод беларускіх спартсменаў. Тыя, хто стаіць ля яго вытокаў, лічаць гэтую дату зыходнай кропкай айчыннага фрыстайла.

— Зараз, пасля трох дзесяцігоддзяў працы, можа, сталі больш праводзіць часу з сям'ёй?

— На жаль, не. Кожны год адзін у адзін супадае з папярэднім, як пад капірку. Зімні спартыўны сезон абмежаваны, некалькі месяцаў, а астатні час — падрыхтоўка да яго. Таму паўгода для родных — я марак дальняга плавання.

— Вы выраслі ў інтэлігентнай сям'і, тата быў вядомым у Беларусі літаратуразнаўцам і крытыкам. Зараз чытаеце беларускую літаратуру?

— Як не стала таты, рэдка чытаю па-беларуску. А раней мова для мяне была чымсьці звыклым, натуральнай часткай жыцця. Мы жылі з бацькамі каля філармоніі. Да нас ледзь не кожны дзень у госці з суседняга дома прыходзіў, напрыклад, Рыгор Няхай, вядомы беларускі пісьменнік. І ўсе яны заўжды размаўлялі па-беларуску. Тады для мяне гэта не было дзівам. А цяпер, калі чую мову, адразу магу сказаць, чыста ці не вельмі размаўляе на ёй чалавек.

— Беларусы — нацыя чэмпіёнаў?

— Тое, што сярод нас яны ёсць, і гэта даволі вялікая праслойка, безумоўна. Я думаю, што сярод беларусаў славалюбівых людзей даволі шмат. І працавітых таксама. Інакш «хачу стаць алімпійскім чэмпіёнам» ці «лаўрэатам Нобелеўскай прэміі» без канкрэтных спраў — словы ў паветра.

— І гэтага досыць, каб стаць чэмпіёнам?

— Тут мусіць быць пэўны збег абставін. Важна, каб у чалавека былі адпаведныя здольнасці. Далей — слушна абраны від спорту. У нас шмат блізкіх, роднасных відаў — гімнастыка, акрабатыка, скачкі ў ваду, фрыстайл. А дасягнуць поспеху чалавеку наканавана толькі ў адным. І трэба не пралічыцца. Таксама важна, каб з трэнерам пашчасціла, з педагогамі. І проста напаткала ўдача.

Налог на прибыль: изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	миллионов рублей	243,00	188,00
Чистая прибыль (убыток)	миллионов рублей	754,00	683,00
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	миллионов рублей	4323,00	3758,00
Долгосрочная дебиторская задолженность	миллионов рублей	0,00	0,00
Долгосрочные обязательства	миллионов рублей	0,00	0,00
Среднесписочная численность работающих	человек	339	418

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: розничная продажа в неспециализированных магазинах пищевыми продуктами, включая алкогольные напитки; прочая торговля в неспециализированных магазинах.
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2015 г.: 25 марта 2016 г.
Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: принять к сведению.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 11 (311)

Ніна ШАРУБІНА і Уладзімір ПЯТРОЎ у спектаклі «Макбет».

ЗАВАРОЖАНЫ КАРОНАЙ

Страсць Макбета абарочваецца трагедыяй для народа

Славутаму палкаводцу караля Дункана вядзьмаркі напрарочылі ўладу.
Спакуса падпарадкавала сабе ўсе яго ўчынкі, ператварыла военачальніка ў подлага забойцу, упэўненага, што ніхто з народжаных жанчынай не можа яму пагражаць.
Так і ёсць...
У Шэкспіра, твор якога натхніў Джузэпэ Вердзі на оперу «Макбет», была паказана трагедыя асобы, але музыка здолела яе ўзмацніць, ператварыўшы ў трагедыю агульнанародную.
Аднак Шэкспіра і Вердзі ўсё ж шукаеш надзею — хоць бы ў кім з герояў.

З надзеяй спрачаецца пастаноўка оперы «Макбет», якую ажыццявіў на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета галоўны рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ. Адкуль надзея, калі ведзьмы правяць балем і фактычна праграмуюць будучыню? Спакуса, укладзеная ў вушы чалавека, саноўнага, але зямнога, ператвараецца ў павуцінне, якое аплятае ўсё навокал, накрывае людзей і нават галоўнага сярод іх. А ў той момант, калі думаеш, што вось-вось яе разарвуць... Яна навісае над тронам і горадам зноў. Які б ні заняў яго кіраўнік, само адчуванне ўлады над іншымі здольнае мяняць асобу, ператвараючы ў пачвару, як гэта адбываецца з Макбетам. Але далей хто, пасля яго?... Такім чынам рэжысёр робіць трагедыю фактычна беспрасветнай.

Хор на сцэне не проста адпрацоўвае свае музычныя нумары, адыгрывае не дэкаратыўную функцыю, а стварае патрэбны для галоўнай ідэі кантэкст грамадскага гучання оперы.

Гэта ягонае прачытанне оперы — і, бадай, галоўнае ў канцэпцыі пастаноўшчыка, якая, відаць, паўстала не толькі дзеля самарэалізацыі. «Макбет» — гэта гісторыя, праз якую можна паразмаўляць з людзьмі, завесці з імі дыялог ці ўступіць у дыскусію пра тое, што ёсць улада і што адбываецца, калі розум увесь час заняты думкамі пра трон, а не інтарэсы каралеўства. Таму гэты трон у цэнтры сцэны: у цэнтры палаца, які ўвасоблены металічнай канструкцыяй-каркасам (мастак-пастаноўшчык Аляксандр Касцючэнка): там, дзе ўсё павінна быць празрыста, як у жыцці, творацца страшныя, схаваныя ад вачэй учынкі.

Канструкцыя паварочваецца і адкрывае нам розныя бакі жыцця караля: грамадскія і асабістыя, а разам з тым — і яго псіхалогію. Таксама як і музыка: у ёй гучаць і сумневы, і чорныя думкі, і цяжкія стогны знявечанай пад уладай тырана краіны. Стогнам здаецца і паварот сцэнаграфічай канструкцыі, што адцягвае ўвагу ад ігры аркестра, і ў такія моманты думалася: а мо так і трэба? Нібыта падпарадкаваўшыся дыктату Макбета...

Прытым, што даволі часта першынство аддадзена апавядальніку. У яго ролі, па сутнасці, павінен выступаць аркестр пад кіраўніцтвам Віктара Пласкіны, таму што ў спектаклі ёсць эпізоды, дзе ўсё вырашае толькі музыка, а яна часам гучыць манатонна (як жыццё ў каралеўстве пры Макбеце?). Рэжысёр дадаў харэаграфічныя нумары з вядзьмаркамі (іх ставілі Юлія Дзятко і Канстанцін Кузняцоў). Паглядзіш на такіх вядзьмарак — і адразу ўзгадваецца Баба Яга ў старых савецкіх казках, якая ўспрымалася нейкім карыкатурным вобразам.

Пэўная стэрэатыпнасць у паказе нячыстай сілы (а яе ў такой колькасці не было нават у Вердзі) не іграе на ідэю спектакля, якому рэжысёр імкнуўся задаць філасофскі тон.

Рэжысёр дадаў харэаграфічныя нумары з вядзьмаркамі (іх ставілі Юлія Дзятко і Канстанцін Кузняцоў). Паглядзіш на такіх вядзьмарак — і адразу ўзгадваецца Баба Яга ў старых савецкіх казках.

А калі так — то носьбітамі нячыстай сілы ў жыцці з'яўляюцца часцей звычайныя людзі. Казачнасці і «каралеўскасці» дадаюць і касцюмы герояў, якія прыдумаў расійскі мастак Вячаслаў Окуневў і Марыя Мароз. Глядзіцца ўсё «па-багатаму», нават з футрам і брыльянтамі на пальцах. І Макбет — кароль Шатландыі...

У Станіслава Трыфанава герой атрымаўся аб'ёмны (яшчэ было б цікава паглядзець на Уладзіміра Пятрова ў гэтай ролі). Злодзей, логіку якога хочацца зразумець — яна прапісаная асобнымі арыямі і дуэтамі. Артыст спяваў і іграў чалавека, які збіўся з курсу, месцамі можна было ўявіць чалавека, блізкага да вар'яцтва. Чалавека, у якога гарыць вока (нават пярсцёнкаў, якія таксама свецяцца, магло і не быць) у моманты найбольшай спакусы ці рашучасці. Ён вёў гэтую гульню.

А Лэдзі Макбет у выкананні Тацяны Трацяк ішла ўслед за суджэнцам — спакушалася яго славай, яго бляскам і магчымасцямі. І сама адчувала спакусу. Яе Лэдзі Макбет атрымалася не жорсткай жанчынай, што кіруе сваім мужам, а наадварот, мяккай, хоць і не без ганарлівасці. Месцамі яе голас гучыць нават нясмела. А знешне мы бачым ракавую жанчыну з рудай капной валасоў. (Яшчэ гэтую партыю спявае Ніна Шарубіна, у яе іншы выгляд). Таму, калі такая паненка пакутуе на самнамбулізм (што сведчыць пра глыбокія перажыванні), дзіву даешся. Хоць з яе ўдзелам прыдуманы ці не самыя эфектныя сцэны ў спектаклі.

Але як ні дзіўна, сапраўдным галоўным героем гэтай пастаноўкі стаў народ — у выкананні хору тэатра. Хор на сцэне не проста адпрацоўвае свае музычныя нумары, адыгрывае не дэкаратыўную функцыю, а стварае патрэбны для галоўнай ідэі кантэкст грамадскага гучання оперы. Таму што ад імя народа чуюцца словы пра няшчасную радзіму, якую заліў крывёй тыран, пра пакуты і надзеі. Яны могуць з'явіцца з новым гаспадаром: ёсць жа тыя, каму ўдалося збегчы ад караля-забойцы. Яны блізка. А разам з імі — зноў навісае павуцінне спакусы ўладай.

Спакуса, укладзеная ў вушы чалавека, саноўнага, але зямнога, ператвараецца ў павуцінне, якое аплятае ўсё навокал, накрывае людзей і нават галоўнага сярод іх.

Міхаіл Панджавідзэ выбірае оперы для пастаноўкі з ліку той класікі, дзе актуальнасць пазачасовая. Умее выбраць, каб яны адгукаліся. «Макбет» — складаная опера не толькі з пункту гледжання тэмы, але і з-за тэатральнай рэалізацыі, падбору артыстаў, якія б, спяваючы, выконвалі яшчэ і драматычныя задачы: тут без іх немагчыма, нават пры ўсёй умоўнасці опернага мастацтва, дзе амаль усё вырашае музыка і галасы. Тэатр замахнуўся на «Вільяма нашага Шэкспіра» на пару з Вердзі, відаць, таму, што адчувае сілы для гэтага. Варта адзначыць выканаўцаў галоўных партый (за імі каласальная праца), але галоўным героем у «Макбеце» становіцца ўсё ж народ. Таму што якія б ні былі кіраўнікі-героі і наадварот, іх дзеянні ніколі не будуць іх асабістай справай.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

ЯК ТРАПІЦЬ У ШОРТ-ЛІСТ?

Нацыянальная літаратурная прэмія пачынае адбор твораў

Пачалі — і спадабалася. Летась упершыню назвалі лаўрэатаў першай Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Пісьменнікі ажывіліся: цяпер важнасць іх творчай справы падкрэслена асаблівай дзяржаўнай увагай. А праз яе — праз рэзананс — кнізе прасцей знайсці шлях да людзей.

Прэмія — гэта перш за ўсё адзнака твора, хоць грашовую частку ніхто не адмяняе. Падтрымаць літаратараў — гэта таксама крок да падтрымкі літаратуры, у якой адлюстроўваецца сучасны твар краіны. Пра гэта, у прыватнасці, гаварыў прафесар Іван Саверчанка на семінары ў Гродна, прысвечаным сучаснай літаратурнай крытыцы. Нацыянальная прэмія паказала, што ў Беларусі ёсць творцы, здольныя зазірнуць углыб чалавечай душы, якія хочуць зразумець, адкуль і чаму ў людзей, якія прадстаўляюць народ, складваецца пэўны тып мыслення, светаадчування. Як гэта здолеў зрабіць пісьменнік Уладзімір Саламаха, што атрымаў прэмію ў намінацыі «За лепшы твор прозы». Ёсць творы, у якіх аўтары шукаюць адказ на пытанне: чым асаблівы наш беларускі менталітэт?.. Гэта праца даследчыкаў, якія адлюстроўваюць час, і гэта першаснае. Але пісьменнік піша для таго, каб яго думкі знаходзілі водгук у іншых. Трэба толькі, каб кнігі знаходзілі чытача, каб у таго было разуменне, чаму трэба чытаць кнігі. У выніку правядзення першай Нацыянальнай прэміі стала нагодай задумацца і пра ролю літаратуры ў грамадстве.

Цяпер пойдзем далей: абвешчаны другі конкурс у рамках Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў 2016 годзе. Лёс прэміі, якая ўручаецца ў сямі намінацыях, вырашае сур'ёзнае журы. Але гэта ў фінальнай частцы. На першым этапе працуе экспертная камісія: разглядае прадстаўленыя творы, вызначае іх якасць, актуальнасць, навізну. І фарміруе шорт-ліст. Але бярэцца за ведама і запатрабаванасць твора (у кнігарнях, бібліятэках, тэатрах, калі гаворка пра драматургію).

Згодна з умовамі конкурсу, удзельнічаць у ім могуць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Але вылучаць творы могуць і аўтарскія калектывы (у складзе не больш чатырох чалавек). Ацэньвацца будуць творы мастацкай літаратуры ў прозе, паэзіі і драматургіі, публіцыстыка, творы ў галіне літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства, якія выпусцілі ў свет выдавецкія арганізацыі Рэспублікі Беларусь у папярэдні год. Гэта могуць быць асобныя друкаваныя выданні ці на электронных носьбітах, ці апублікаваныя ў сродках масавай інфармацыі літаратурна-мастацкай накіраванасці. І як у наш час не ўлічваць уплыў глабальнай сеткі інтэрнэт, дзе таксама размяшчаюцца творы, чытаюцца і актыўна абмяркоўваюцца? Літаратурная прастора цяпер даволі шырокая.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца Міністэрствам інфармацыі (галоўны арганізатар ад імя дзяржавы) да 1 ліпеня. Прадставіць іх могуць асобныя аўтары, а таксама аўтарскія калектывы, творчыя саюзы, выдавецкія арганізацыі, установы адукацыі і навукі, якія маюць дачыненне да мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Адзін аўтар можа прымаць удзел не больш чым у адной намінацыі і з адным творам. А ўжо з 1 жніўня з усімі вылучанымі творамі павінна знаёміцца журы, каб вызначыць пераможцаў. Часу на ўсё няшмат, ужо 4 верасня ў Рагачове падчас адкрыцця Дня беларускага пісьменства будуць абвешчаныя вынікі конкурсу, названыя лепшыя творы і ўзнагароджаны іх аўтары.

Але сутнасць у тым, што лепшыя кнігі, якія адзначыць журы, ужо напісаны, выдадзены. Іх можна прачытаць. І нехта, напэўна, гэта ўжо зрабіў. Прэмія існуе для таго, каб, звярнуўшы ўвагу на лепшае, трымаць узровень літаратуры, які дазволіць ёй развівацца. Яна для тых, хто стварае без думак пра высокія адзнакі.

Дзяніс Марціновіч, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «За лепшы крытычны твор», аўтар кнігі «Жанчыны ў жыцці Уладзіміра Караткевіча» лічыць, што прэміі ёсць куды ўдасканальвацца:

— Прэмія дае невялікую суму грошай (пасля выплаты падаткаў я атрымаў каля 4,2 мільёна), згадзіцеся, гэта сума не можа кампенсаваць час, калі ты пісаў кнігу. Таксама яна дае шэраг згадак у СМІ, бо імёны пераможцаў надрукавалі шмат газет і выданняў. Ну і маральнае задавальненне. Прыемна, што тваю кнігу заўважылі і ацанілі...

Галоўнае ў любой прэміі — думкі пра ўдасканаленне. Каб сёлета гэта было больш прадстаўніча, чым летась. Каб і па колькасці твораў, і па іх якасці можна было гаварыць пра развіццё. З аднаго боку — літаратуры, з другога — чытача. Чалавека. І наогул грамадства.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ На экране

Слаўны валацуга Тора-сан

КУЛЬТАВАЯ ЯПОНСКАЯ КАМЕДЫЯ Ў МІНСКУ

Японскія кінакампаніі ў 1960-х гадах апынуліся ў складаным становішчы: вялікі экран, шырокі фармат, кінатэатры сталі прайграваць у папулярнасці тэлебачанню, доля замежнай кінапрадукцыі павялічылася, а цікавасць да кіно ўвогуле ўпала. Некаторыя кінакампаніі ў тыя часы абанкроціліся. Але не легендарная «Сёціку»: своечасова яна падхапіла ідэю тэлевізійнага камедыйнага серыяла «Мужчыну жывецца цяжка», дзякуючы якому, можна сказаць, выратавалася ад сыходу ў небыццё. У выніку за дваццаць шэсць гадоў кінакампанія стварыла 48 фільмаў з адным героем — Тора-санам, якога іграў акцёр Кіёсі Ацумі. Чатыры з гэтых сарака васьмі карцін будуць паказаны ў рэтраспектыве, якая пройдзе ў Мінску з 31 сакавіка да 3 красавіка.

Галоўны герой малаадукаваны, няхітры, што называецца, чалавек-катастрофа, які пастаянна трапляе ў розныя няёмкія сітуацыі альбо іх стварае. Але пры гэтым ён адкрыты, дабрадушны чалавек, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу.

Серыял, які стаў натхненнем для кінакампаніі «Сёціку», выйшаў на тэлеэкраны Японіі ў 1968 годзе. Магчыма, ён так і застаўся б у гісторыі выключна тэлевізійным фільмам, калі б не адзін сюжэтны паварот: у заключным эпізодзе галоўны герой — персанаж, якога паспелі палюбіць гледачы, — узяў ды памёр. Гэта выклікала хвалю нездаволенасці, што і прыцягнула ўвагу «Сёціку».

Напэўна, не палюбіць яго было немагчыма. Персанаж Тора-сан нарадзіўся ў беднай сям'і ў квартале Сібамата — частцы Токіа, дзе селіцца просты працоўны люд. Сам герой малаадукаваны, няхітры — што называецца, чалавек-катастрофа, які пастаянна трапляе ў розныя няёмкія сітуацыі альбо іх стварае. Але пры гэтым ён адкрыты, дабрадушны чалавек, які заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. Тора-сан рана страціў бацькоў і з тых часоў вядзе вандроўны лад жыцця, але часам ён вяртаецца ў родныя мясціны, што становіцца сюжэтам для чарговай серыі.

На рэтраспектыве будзе паказаны ў тым ліку першы фільм серыі — «Мужчыну жывецца цяжка. Наш слаўны валацуга Тора-сан», дзе галоўны герой прыязджае дадому і сустракаецца з малодшай сястрой Сакурай, якая збіраецца выйсці замуж. Брат, не кантралюючы сябе, устройвае скандал, і вяселле адмяняецца. У карцінах «Тора-сан і каханне пад парасонам» і «Тора-сан, рэлігія, каханне» адлюстроўваецца пастаянны матыў серыі — каханне без узаемнасці. У першай карціне закаханыя ў Тора-сана, у другой — наадварот. У серыі «Усход і барвовы захад Торадзіра» да нечаканых наступстваў прыводзіць знаёмства галоўнага героя са знакамітым мастаком і п'яніцам, якога той прымае за валацугу.

Адным са сцэнарыстаў тэлефільма быў Ёдзі Ямада, які стаў рэжысёрам усіх сарака васьмі фільмаў «Мужчыну жывецца цяжка». Ён паспяхова працуе да сённяшняга дня і з'яўляецца частым госцем Берлінскага кінафестывалю: некалькі разоў яго карціны намінаваліся на галоўную ўзнагароду, а ў 2010 годзе Ямада атрымаў Ганаровы прыз Berlinale Camera Award.

Серыял «Мужчыне жывецца цяжка» трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса як самы працяглы ў гісторыі кіно — ён здымаўся з 1969 да 1995 года.

Праект серыяла «Мужчыну жывецца цяжка» быў новым для японскага кіно, але не для сусветнага кінематографа. Галоўнага героя Тора-сана параўноўваюць з персанажам Шарло Чарльза Чапліна, але і ў таго былі папярэднікі. Фармат шматсерыйных камедый становішчаў быў створаны яшчэ піянерамі кінематографа ў Францыі. Макс Ліндар пераняў эстафету ў камічнага кінаакцёра Андрэ Дзіда, які з'ехаў працаваць у Італію і стварыў пастаянны кінавобраз — элегантнага француза ў касцюме-тройцы, легкадумнага і гультаяватага Макса, які то вучыцца катацца на каньках, то вырашае прыняць ванну, то ідзе на карнавал, што кожны раз суправаджаецца шэрагам жартаў і смешных сітуацый. Дарэчы, серыя фільмаў з Максам Ліндарам упершыню сфарміравала статус кіназоркі, і ганарар кінаакцёра стаў большым за ганарар тэатральнага артыста. Як пяціхвілінныя сюжэты, так і больш доўгія і насычаныя «становішчамі» карціны — «Макс і яго першая цыгара», «Макс і яго цешча», «Макс і хінная настойка» — зрабілі Ліндара сусветна вядомым.

Амерыканскае кіно хутка падхапіла гэты фармат і стала ў вялікай колькасці выпускаць на экраны створаныя амаль на «канвееры» камедыі становішчаў, поўныя пагоняў, падзенняў і кідання тортамі. З гэтага пачыналі і тры вялікія амерыканскія комікі — Чарльз Чаплін, Бастар Кітан і Гаральд Ллойд. Памятаеце, як гэтыя імёны адзін за адным з'явіліся ў тытрах савецкага мюзікла «Вясёлыя рабяты» з дабаўленнем выразу «... у фільме не здымаліся»? Савецкія жарты.

У гэтай школе сфарміраваўся найвядомейшы кінавобраз — персанаж Шарло ў шырокіх штанах, кацялку, не па памеры вялікім абутку і з палачкай. Джэнтльмен з трушчоб, гуманіст з вуліцы, шукальнік прытулку на гэтым свеце.

Тора-сан нагадвае яго не знешне, а па характары персанажа і, канешне, па сацыяльным становішчы вандроўніка, валацугі. Дарэчы, серыял «Мужчыну жывецца цяжка» трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса як самы працяглы ў гісторыі кіно — ён здымаўся з 1969 да 1995 года, работа над ім была скончана, толькі калі памёр Кіёсі Ацумі, што выконваў галоўную ролю.

Фільмы рэтраспектывы, арганізаванай Цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн», Японскім фондам, пасольствам Японіі ў Беларусі і кампаніяй «JTI», будуць паказвацца ў кінатэатры «Перамога».

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Нагода

Якія тэатры самыя папулярныя?

Заўтра, 27 сакавіка, адзначаецца інтэрнацыянальнае свята — Сусветны дзень тэатра, «тэатра як сродка ўзаемапаразумення і ўмацавання міру паміж народамі». Таму своечасова будзе нагадаць, што па колькасці праведзеных мерапрыемстваў у разліку на адзін тэатр і па колькасці іх наведванняў мы сярод краін СНД займаем лідзіруючыя пазіцыі. У 2015 годзе, паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, беларускія тэатры правялі амаль дзевяць тысяч спектакляў, канцэртаў і творчых сустрэч.

Мяркуючы па статыстыцы канца мінулага года, у краіне працуе 28 прафесійных тэатраў, адзін з якіх — оперы і балета, восем — дзіцячых і юнага гледача і дзевятнаццаць драматычных і музычных. Іх рэпертуар у 2015 годзе склаў 1011 пастановак, 123 з якіх — новыя, а 342 створаны па творах беларускіх аўтараў. Дарэчы, доля дзіцячых спектакляў у агульнай колькасці дасягае 42,1%, што значыць 426 пастановак.

Каля 1,8 мільёна гледачоў наведалі тэатры ў 2015 годзе, амаль палову з іх прыцягнулі да сябе сталічныя сцэны. На першым месцы знаходзіцца Вялікі тэатр оперы і балета — яго пастаноўкі за год паглядзелі амаль 245 тысяч чалавек.

Другую пазіцыю, з прыкладнай лічбай 144 тысячы гледачоў, займае Дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр у Мінску. Акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску наведалі больш за 88 тысяч, ён на трэцім месцы.

На чацвёртым месцы замацаваўся Тэатр драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску, яго папулярнасць вымяраецца больш чым 84 тысячамі наведвальнікаў у год. 81 тысяча чалавек за мінулы год паглядзела спектаклі Акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага ў Мінску, які закрывае пяцёрку самых любімых беларускімі гледачамі сцэн.

Сусветны дзень тэатра — гэта і падстава абмеркаваць праблемныя пытанні — інтарэс да тэатральнага мастацтва з боку гледача, фінансаванне, якасць пастановак, супраца з беларускімі драматургамі, уліванне ў працэс маладых аўтараў, суіснаванне акадэмічнасці і пэўнага канцэптуалізма, супраца з замежнымі калегамі.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-8750 1973 года постройки, общей площадью 353,9 кв.м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Суворова, 64, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж стоимостью 923 800 000 рублей
Собственник (владелец) имущества	ООО «Полоцкая строительная компания» (г. Полоцк, ул. Суворова, 64)
Местонахождение (адрес) имущества	Витебская область, г. Полоцк, ул. Суворова, 64
Наличие обременений	Без обременений
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка г. Полоцк, ул. Успенская, 2, каб. 12 06 апреля 2016 года в 15.00
Справочная информация	Справочная информация об организации торгов: ГУЮ Витоблисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 18, www.vitebskjust.gov.by. Судебный исполнитель Пашкевич Майя Владимировна, тел.(80214)44 20 52
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Полоцкого района и г. Полоцка: ф-л 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 648, р/с 3642903000517, УНН 300002505 **не позднее 05.04.2016 года.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

■ Невядомае пра вядомых

АНЭЛЯ ТУЛУПАВА — ЧАЛАВЕК-МОРА, ЧАЛАВЕК-ЗОРКА

Яна мела тры вялікія мары: даляцець да зорак «і самой паглядзець як там што на самай справе», вылечыць усіх анкалагічных хворых, напісаць багата кніжак. Яна любіла мора і палёты на самалётах. Была добрай лекаркай, таленавітай дыктаркай, адоранай паэткай і аўтаркай песень, перакладчыцай. Уважлівай жонкай і клапатлівай маці, бабуляй. А яшчэ — вялікай пакутніцай і шчырай верніцай...

Але чаму — была? Яе песні і сёння гучаць па радыё і са сцэны, вершы, паэмы і апавяданні захапляюць чытачоў, а жыццё застаецца прыкладам спагады да чалавека, неверагоднай дабрыні і вялікай самаахвярнасці. Яна — ёсць. Сёння разам з яе дачкой Алесяй Саротнік (далей — **А.С.**) і ўнучкай Валерыяй (далей — **В.С.**) мы ўспамінаем маці, бабулю Анэлю Тулупаву. Яна пайшла з жыцця з-за цяжкой хваробы, перад смерцю прыняўшы таемны пострыг і стаўшы манахіняй Неанілай...

— Пытанне пра таемнае манаства паэткі Анэлі Тулупавай, напэўна, — адно з найскладанейшых, але разам з тым яно ўзнікае найчасцей. Як сям'я, сябры ўспрынялі гэты крок? Ці зразумелі, прынялі?

А.С.: Зразумейце, калі ласка: таемнае манаства на тое і таемнае, каб пра яго *не даведаліся*. Што да сяброў — для некага гэта быў шок, для «мірскіх» сяброў, дарэчы. Але я не памятаю асаблівых рэакцый з боку тых, для каго гэта сапраўды мела сэнс. А мы — нам давялося даведацца таму, што трэба было адзяваць і хаваць яе па асабістым чыне. Зразумелі, прынялі — пра гэта гаворка не ідзе, чалавек ішоў да гэтага і гэтага хацеў, усё астатняе — паміж ёй і Богам. Кропка.

З дачкой Алесяй і ўнучкай Валерыяй, 1995 год.

— Напэўна, ёй было складана несці паслух, манаства не ў сценах манастыра, дзе гэта заканамерна і цалкам укладваецца ва ўспрыманне людзей, але дома, у грамадстве?

А.С.: Адкажу, як змагу. Па-першае, ізноў таемны пострыг павінен заставацца таемным, разумееце? Пра паслушэнства мы не можам ведаць. Канешне, можна заўважыць тое, што на паверхні — бо чалавек пакрысе змяняецца. Яна некаторы час паспела яшчэ паездзіць па святых месцах, нават да некалькіх старцаў. Па-другое, пострыг, як мы даведаліся пры пахаванні, адбыўся незадоўга да яе смерці — а тады ўсё было цяжка...

— Калі я слухала радыёперадачу «Крылы» з Галінай Шаблінскай, гераіняй якой неяк была ваша мама, бабуля, то звярнула ўвагу на адно яе выказванне. Нягледзячы на тое, што спадарыня Анэля прайшла шмат выпрабаванняў у сваім жыцці, яна кажа, што была шчаслівая нават у самыя страшныя гады, знаходзіць станоўчае нават у часы ваеннага ліхалецця. Кажа, што людзі былі добрыя і спагадлівыя. Як лічыце, дзе крыніца такога шчасця, бязмернай веры ў чалавека?

А.С.: Мне гэта падаецца вызначальнай рысай усяго пасляваеннага пакалення — падумайце самі, каб перажыць такое бедства, як вайна, трэба знаходзіць у сабе моц верыць, што важна — верыць у людзей. Бо як інакш? Вось і маці была такой.

— Чытаючы расповеды пра жыццё Анэлі Тулупавай, дзіву даешся, колькі можа перажыць чалавек... Ваеннае дзяцінства, нястача, адукацыя акушэркі, ганаровае донарства, пошук свайго паэтычнага голасу. Здрада першага каханага. Але яе сэрца не ачарсцвела, яна не страціла веры ў свае сілы, захавала той самы «настрой пеўня» (як яна сама казала), каб змагацца і перамагаць. Проста неверагодны прыклад жыццёвай моцы такой маленькай жанчыны!

А.С.: «Перажыць» тут не зусім карэктнае слова. Вы ж самі і сказалі пра «настрой пеўня» *(смяецца)*. Маці нават на экзамены ішла з думкай: «Хто каго — я экзамены, ці яны мяне». Так што жыццёвыя нягоды і ўсё гэткае для яе былі не іспытамі, якія трэба «перажыць», а хутчэй... выклікамі, калі можна так сказаць. Дуэлямі, з якіх яна выходзіла пераможцай. Усё атрымліваецца наадварот — яе жыццёвая смеласць і здольнасць рызыкаваць, тое, што яна не баялася браць на сябе адказнасць, яе «медыцынская» храбрасць і ўменне хутка і спакойна прымаць рашэнні — гэта ўсё і дапамагала не ачарсцвець яе сэрцу і розуму і прыцягвала да яе людзей.

— Кажуць, што спадарыня Анэля мела дар прароцтва. Сама прыдумала сабе вобраз першага кахання і потым яго сустрэла, ён аказаўся менавіта такім, як яна ўяўляла. Прадказвала некаторыя рэчы і ў побыце. Ці сапраўды гэта так?

А.С.: Смех смехам, але нешта такое было, так. Вось толькі, з яе ўласных слоў, яна, быў час, малілася, каб гэты дар, калі ён не ад Бога, знік. І ён знік. Думайце пра гэта, што хочаце.

— Важную ролю ў жыцці жанчыны адыгрывае каханне, сям'я, рэалізаванасць у ролі маці, жонкі. Спадарыня Анэля тут раскрылася напоўніцу, была шчаслівай у шлюбе?

А.С.: Сям'я ёсць сям'я — усяго было, і радасцяў і нягод, але ж жыццё з таго і зроблена. Маці, паверце, была даволі цвёрдым чалавекам, не схільным да сантыментаў. Бацька, дарэчы, адным з першых паверыў у яе як у паэта — дагэтуль захаваўся вялізны, тоўсты слоўнік Якуба Коласа, сапраўдны клад для лінгвіста ўвогуле, што казаць пра журналіста і пісьменніка, — які быў ягоным шлюбным падарункам.

В.С.: Што тычыцца мяне, не бяруся судзіць пра іх з дзедам і маці жыццё як сям'і, я не ведаю і не магу ад сябе сказаць, якой яна была маці, а якім бацькам быў мой дзед, — але яны былі адмысловымі дзедам і бабуляй. Гэта я асабіста ведаю дакладна і добра.

— Валерыя, я ведаю, што вы таксама пішаце. Наколькі моцны ўплыў бабулі на вашу творчую індывідуальнасць?

В.С.: Яна, скажам так, падрыхтавала глебу для таго, каб на ёй нешта літаратурнае пачало потым фарміравацца. Разумееце, бабуля памерла, калі мне было трынаццаць гадоў, і не сказаць, каб я многа пісала тады. Усё пачалося пасля яе сыходу з жыцця. Але я ўсё ж такі лічу бабулю своеасаблівым маяком — з боку стылю, як мінімум, з боку пабудовы верша і рыфмы.

— Неяк ва ўспамінах вы пісалі, што часам, працуючы над новымі творамі, у думках спрачаецеся з бабуляй. У якіх пытаннях вашы меркаванні не супадаюць?

В.С.: А давайце абыдземся, мабыць, толькі канстатацыяй факта? Бо гэта асабістыя рэчы, пра якія ведалі толькі мы з бабуляй. Што магу сказаць: ведаючы мой сённяшні характар і яе той, які я памятаю, цяпер спрэчак было б занадта многа — нават у плане побыту, што ўжо казаць пра філасофскія і рэлігійныя пытанні. Але, магчыма, з гэтай жа прычыны я так прагну час ад часу падзяліцца менавіта з ёю, а не з бацькамі ці сябрамі тым, што вынаходжу, — у літаратуры, у рэлігіі і гэтак далей.

— Я чытала, што спадарыня Анэля не шкадавала лістоў, якія ёй пісалі, з лёгкасцю развітвалася з адзеннем, таму засталася толькі вясельная сукенка. А як жа з рукапісамі? Яны засталіся?

В.С.: Нешта засталося — дарэчы некалькі рэчаў яна-такі здала ў архіў. Я вельмі добра памятаю, як у школьныя гады рашала задачкі на бабуліных старых рукапісах — гэта, па большай частцы, былі чарнавікі, канешне. Што не перашкаджала мне, замест таго, каб рабіць хатняе заданне, чытаць яе вершы.

— Ці захоўвае архіў паэткі новыя творы, якія яшчэ чакаюць свайго шляху да чытача?

А.С.: Чакае выдання пасмяротны зборнік «Мой сад» — яе выбранае і крыху самых позніх вершаў, што друкаваліся выключна ў перыёдыцы. І не ведаю, ці дачакаецца — бо ляжыць у выдавецтве каторы год. Трэба адзначыць, пры жыцці маці амаль не друкавала сваю прозу, — а яна ў яе ёсць. Калі мы збіралі да яе 65-гадовага юбілею інфармацыю пра ўсе творы, то ў слоўніку беларускіх пісьменнікаў знайшлі толькі тры вельмі ранніх апавяданні. А ўжо значна пазней, вось у тых самых рэдкіх рукапісах, нам траплялася яшчэ колькі аўтабіяграфічных апавяданняў, што маці пісала ў 17-19 гадоў, яны нідзе не друкаваліся ў той час. А яшчэ, адна вялікая аповесць пра вайну. Амаль усё, акрамя аднаго апавядання, мы змаглі надрукаваць. Я мару пра зборнік матулінай прозы — хоць яе і не так многа было. Ці хоць бы пра перавыданне трох яе дзіцяча-падлеткавых твораў. І, канешне, працягваю спадзявацца, што аднойчы матулін «Мой сад», яе, так скажам, падвядзенне вынікаў жыцця, «прарасце» да чытачоў.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

Фотаздымкі з сямейнага архіва Алесі і Валерыі САРОТНІК

Сустрэча з чытачамі.

Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
17 марта 2016 г.
Сушко С.А.

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием участников ООО «ЗападИнвестСистемз»
11.01.2016 (Протокол № б/н)

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА

Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 11.01.2016 № б/н вносит следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (номер государственной регистрации 5-200-02-2513, дата государственной регистрации 03.03.2015) (далее – Проспект эмиссии):

1. Пункт 1.2 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«**1.2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 2.

Телефон/факс: 8 (017) 302-84-10.

Электронный адрес (e-mail): info@tapas.by».

2. Пункт 2.5 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«**2.5. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается поручительствами:

1. Общества с ограниченной ответственностью «БелОбъектСтрой» на сумму 569 000 000 (Пятьсот шестьдесят девять миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Минская область, Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 37, пом. 1-2.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691365787.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 3 786 млн. белорусских рублей;

2. Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» на сумму 2 431 000 000 (Два миллиарда четыреста тридцать один миллион) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 19.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 190976309.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 58 789 млн. белорусских рублей;

3. Общества с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «МЕГАПОЛИС» на сумму 2 800 000 000 (Два миллиарда восемьсот миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220114, г. Минск, ул. Филимонова, д. 22, офис 8.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 191602738.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 2 892 млн. белорусских рублей;

4. Общества с ограниченной ответственностью «Торговый центр Пассаж» на сумму 920 000 000 (Девятьсот двадцать миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 10.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 192153999.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 14 919 млн. белорусских рублей;

5. Унитарного предприятия по оказанию услуг «Белскладкомплекс» на сумму 1 200 000 000 (Один миллиард двести миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 № б/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Минская обл., Минский район, а/г Колодищи, ул. Чкалова, д. 37, пом. 3.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691548397.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 68 917 млн. белорусских рублей.

В случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом обязательств перед владельцами облигаций требования к поручителям предъявляются в письменной форме с приложением выписки по счету «депо», подтверждающей право собственности владельца на данные облигации и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением облигаций обязательствами). Данное требование должно быть представлено поручителю по его месту нахождения.

Поручитель отвечает в том объеме, за который поручается.

При получении требования поручитель обязан рассмотреть его в срок, не превышающий 15 (Пятнадцать) календарных дней. При принятии положительного решения по вопросу исполнения обязательств эмитента по облигациям платеж в пользу обратившихся к поручителям владельцев облигаций осуществляется поручителем в течение 30 (Тридцати) банковских дней.

Договор о предоставлении поручительства вступает в силу с момента его подписания эмитентом и поручителем и действует в течение всего срока обращения облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения облигаций.

Действие договора о предоставлении поручительства прекращается после исполнения обязательств по облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска облигаций) либо по истечении трех месяцев после окончания срока обращения облигаций, если владельцы облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по облигациям к эмитенту или к поручителю.

В случае принятия решения о ликвидации поручителя, а также в случае, если стоимость чистых активов поручителя, рассчитываемая на первое число каждого квартала, станет меньше объема находящихся в обращении облигаций, эмитент, в течение двух месяцев с момента возникновения одного из вышеперечисленного основания осуществляет полную замену обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо в части недостающей стоимости чистых активов данного поручителя или осуществляет досрочное погашение данного выпуска облигаций либо его части. В случае принятия эмитентом решения о полной замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо его части, эмитент вносит соответствующие изменения в Проспект эмиссии и в Решение о выпуске облигаций. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок известить о данном факте владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

Эмитент по собственной инициативе вправе принять решение о замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям с обязательным согласованием данного вопроса с владельцами облигаций до принятия данного решения эмитентом. Замена обеспечения осуществляется эмитентом после внесения соответствующих изменений в Проспект эмиссии и в Решение о выпуске облигаций. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок оповестить о таких изменениях владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

При несогласии владельца(ев) облигаций с заменой эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям владелец(цы) облигаций вправе предъявить эмитенту облигации к выкупу в течение 60 (Шестидесяти) календарных дней с момента получения письменного уведомления о замене эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям. В данном случае замена эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям осуществляется после удовлетворения требований владельцев облигаций, несогласных с заменой эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям. Выкуп облигаций производится в аналогичном порядке, определенном пунктом 2.14 настоящего Проспекта.».

3. Пункт 2.7 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17.

Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме (далее – договор с эмитентом), предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.».

4. Остальной текст Проспекта эмиссии жилищных облигаций остается без изменений.

Генеральный директор Управляющей компании эмитента	И.Я. Кривецкий
Ответственный бухгалтер Эмитента	О.Э. Мышаковская
от поручителя ООО «БелОбъектСтрой» в лице директора	П.Е. Титлов
от поручителя ООО «ТАПАС ПЛЮС» в лице директора	С.П. Ставер
от поручителя ООО «Агентство недвижимости «МЕГАПОЛИС» в лице директора	Ф.А. Катиков
от поручителя ООО «Торговый центр Пассаж» в лице управляющей компании ООО «ТАПАС ИНВЕСТКАПИТАЛ» в лице заместителя управляющего по экономике и финансам	И.С. Партнова
от поручителя Унитарное предприятие «Белскладкомплекс» в лице управляющего	ИП Добровольский А.А.
Директор Департамента финансовых рынков ОАО «БПС-Сбербанк»	С.А. Стецюра

УНП 191755772

■ Рукапісы не гараць

ДУХОЎНАЯ МУЗЫКА НАРАДЖАЛАСЯ Ў ГОМЕЛІ

НЕВЯДОМАЕ Ў БІЯГРАФІІ АЎТАРА ПЕРШАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ОПЕРЫ

Забытыя партытуры беларускага кампазітара Аляксея ТУРАНКОВА прачыталі ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы Гомеля. Дзякуючы гэтаму музычныя калектывы наноў адкрылі аўтара, які моцна паўплываў на развіццё беларускай музыкі ў пачатку XX стагоддзя.

Ад нараджэння Аляксея Туранкова ў Пецярбургу прайшло 130 гадоў. Але жыў ён на тэрыторыі сучаснай Беларусі, дзе і стварыў гарманізацыі праваслаўных спеваў і духоўнай музыкі, балет «Лясная казка» на ўласнае лібрэта, кантату «Пушкіну», цыклы рамансаў на тэксты Коласа, Купалы і Багдановіча, музыку для сімфанічнага аркестра, спектакляў і кінастужак, зрабіў апрацоўкі беларускіх народных песень.

Архімандрыт Свята-Мікольскага манастыра ў Гомелі Сава (Мажука) даўно займаецца вяртаннем забытых імён айчыннай гісторыі. Біяграфія Аляксея Туранкова — складаная і супярэчлівая — стала сапраўдным здабыткам.

Па словах святара, які шмат часу правёў у архівах і размовах са сваякамі кампазітара, у Туранкова былі дзве біяграфіі. Адна з іх — цалкам пралетарская: дзявятае дзіця ў сям'і дворніка зацятай працай і адоранасцю прабіла сабе дарогу да мастацтва. У сіроцкім прытулку Аляксей навучыўся іграць на скрыпцы і духавых інструментах, а ў выніку стварыў першую нацыянальную беларускую оперу, стаў пладавітым кампазітарам, вядомым педагогам і грамадскім дзеячам. У 1938 годзе — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР першага склікання; у 1940 — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Гэта — афіцыйныя звесткі.

— Але ёсць падставы лічыць, што ў афіцыйнай біяграфіі не ўсё праўда, так кажуць і сваякі кампазітара, — адзначае айцец Сава. — Час быў вельмі складаны, у розных анкетах ёсць дэталі, якія не стыкуюцца. Магчыма нават, ён не быў сынам дворніка, бо атрымаў вельмі добрую музычную адукацыю ў Пецярбургскай харавой школе пры прыдворнай пеўчай капэле. На той момант гэта было харавое вучылішча найвышэйшага ўзроўню. Для аплаты кансерваторыі, дзе Туранкоў вучыўся па спецыяльнасці

Кампазітар Аляксей ТУРАНКОЎ.

царкоўнага кампазітара, яму прыйшлося зарабляць рэпетытарствам. Ён выкладаў сальфеджыа, працаваў у аркестры... У 1914 годзе трапіў на фронт Першай сусветнай вайны і служыў у арміі да 1918 года. Дарэчы, і ў ваенны час не пераставаў пісаць царкоўную музыку. Да таго ж, быў рэгентам — кіраўніком мужчынскага хору ў стаўцы імператара Мікалая II у Магілёве. Вось пра гэта ён асабліва баяўся расказваць, нават сваякам.

Публікавацца як царкоўны кампазітар Аляксей Туранкоў пачаў у 1912-м. За сем гадоў выйшла некалькі зборнікаў яго арыгінальных твораў (спачатку для мужчынскага хору) і гарманізацый. Яго духоўныя работы былі шырока вядомыі і запатрабаванымі.

— Я чуў творы Туранкова — іх спявалі ў нашай Мікольскай царкве, у Петра-Паўлаўскім саборы Гомеля — яшчэ да таго, як высветліў, што ён жыў у нашым горадзе, — з захапленнем кажа айцец Сава. — Ён стаяў ля вытокаў гомельскай музычнай школы — у шырокім сэнсе. У 1919 годзе Туранкоў быў адным з арганізатараў Народнай кансерваторыі, пераўтворанай у Дзяржаўную музычную школу 1-й і 2-й прыступкі. На яе базе ў тыя гады быў створаны Дзяржаўны музычны тэхнікум — сённяшні музычны каледж імя Сакалоўскага. У наш горад ён трапіў, ажаніўшыся з дачкой рэгента гомельскага Петра-Паўлаўскага сабора Івана Фалькоўскага. Тут у 1918 годзе і вянчаўся з ёй.

Да 1934 года Аляксей Туранкоў жыў у Гомелі. У паслярэвалюцыйны перыяд ён пісаў шмат свецкай музыкі, апрацоўваў народныя мелодыі і нават складаў песні-агіткі. Адказ на пытанне, ці пісаў ён у гэты час царкоўную музыку, архімандрыт Сава знайшоў у нотным архіве іншага вядомага царкоўнага кампазітара, адданага вучня Аляксея Туранкова.

— Мікалай Бутома адзін з двух сшыткаў партытур кампазітара суправаджае такім запісам: «Туранковым было напісана вельмі многа духоўна-музычных твораў... Гэта была вялікая партытура — каля ста спеваў. Ёю карысталіся ўсе кіраўнікі царкоўных хораў Гомеля. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Туранкоў, працуючы ў Музтэхнікуме, зацікавіўся царкоўнымі спевамі і напісаў каля ста нумароў розных царкоўных спеваў». У свецкіх зборніках згадваецца толькі сорак пяць яго царкоўных твораў, але кажуць, што іх было больш за дзве сотні. Увесь нотны архіў загінуў падчас вайны.

Белых плямаў у біяграфіі кампазітара застаецца шмат. Невядома імя яго першай жонкі і лёс яго першага шлюбу: аўдавеў ці развёўся? Жыццё з другой жонкай Ксеніяй Якаўлеўнай працягвалася ўжо ў Мінску, дзе ён пачынаў «з нуля» — альтыстам у сімфанічным аркестры.

— Чаму ён з'ехаў з Гомеля? — пытаецца айцец Сава і сам адказвае. — У 1933 годзе актывізавалася барацьба з царквой, тады адбыліся першыя расстрэлы святароў. Каму больш «пашчасціла», былі сасланы. Магчыма, Туранкоў баяўся, што нехта ўзгадае яго царкоўную біяграфію, таму з'ехаў у Мінск, дзе і пайшоў працаваць у аркестр. Да вайны ён актыўна публікаваўся як свецкі кампазітар. Мне давялося бачыць у бібліятэчных архіўных падшыўках газет шмат яго песень, напрыклад «Гімн сталінскай Канстытуцыі».

Ёсць яшчэ адна старонка біяграфіі Аляксея Туранкова, якую не любілі ўзгадваць прыхільнікі «правільнай» версіі. Амаль ні ў адной крыніцы не гаворыцца пра турэмны досвед кампазітара. Аляксей Туранкоў быў арыштаваны 22 ліпеня 1944 года, а прысуд быў агучаны амаль праз год — 23 чэрвеня 1945 года. Яму было прад'яўлена абвінавачванне па артыкуле 63-1 Крымінальнага кодэкса БССР: дапамога нямецкім акупантам. Прысудзілі дзесяць гадоў лагераў, пяць гадоў паражэння ў правах з канфіскацыяй маёмасці.

Блізкі сябар Туранкова кампазітар Анатоль Багатыроў расказваў, чаму так адбылося: партызаны хацелі вывезці Аляксея Яўлампіевіча з акупіраванага Мінска і прыслалі да яго юнака. Той падышоў на вуліцы і стаў настойліва ўпэўніваць кампазітара ісці з ім у лес. Туранкоў вырашыў, што гэта правакацыя, і паспрабаваў адстаць ад сувязнога, пачаў крычаць. Гэта прыцягнула ўвагу немцаў, хлопца схапілі і, як пазней высветлілася, закатавалі ў засценках гестапа. За смерць гэтага партызана Туранкова і пакаралі.

У 1933 годзе актывізавалася барацьба з царквой, тады адбыліся першыя расстрэлы святароў. Каму больш «пашчасціла», былі сасланы. Магчыма, Туранкоў баяўся, што нехта ўзгадае яго царкоўную біяграфію, таму з'ехаў у Мінск, дзе і пайшоў працаваць у аркестр.

Між тым Аляксей Яўлампіевіч 3 кастрычніка 1955 года быў амнісціраваны, а 21 кастрычніка 1959-га — рэабілітаваны. Аднак да гэтай даты ён не дажыў. Кампазітар памёр 27 верасня 1958 года.

Нядаўна некалькі твораў кампазітара, якія захаваліся ў рукапісах, ажылі і наноў загучалі ў сценах гомельскай бібліятэкі, якая даўно супрацоўнічае з мужчынскім Свята-Мікольскім манастыром. Дзякуючы намаганням яго святочнага хору (рэгент Алена Бачкарова) і мужчынскага ансамбля пад кіраўніцтвам Аляксея Беланожкі прагучалі духоўныя спевы Туранкова, многія з якіх выконваліся ўпершыню. Архімандрыт Сава (Мажука) саліраваў у адным са спеваў.

— Спраўдзілася мая мара — выканаць псалом пад назвай «Рече безумен» на музыку Аляксея Туранкова. Яго творы як царкоўнага кампазітара неверагодна прыгожыя, дзіўна гарманічныя і адначасова вельмі складаныя для вывучэння і выканання. Па гэтай прычыне пачуць іх за набажэнствам можна рэдка. Для выканання гэтых твораў патрэбен вельмі добры калектыў. Гэта ўказвае на высокі ўзровень царкоўнага пеўчага мастацтва ў нашым горадзе пачатку XX стагоддзя.

Мужчынскі хор пад кіраўніцтвам Аляксея БЕЛАНОЖКІ.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by
Фота аўтара і архіўныя

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЖАБИНКОВСКОМ РАЙОНЕ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

№ лота	Адрес участка/ кадастровый номер	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке
1	Жабинковский с/с, д. Щеглики, ул. Камышовая, 11	122580608601000189	0,1510	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	43 068 200	8 600 000	-	0,0040 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт, 0,1510 га – охранная зона мелиоративных земель
2	Жабинковский с/с, д. Сеньковичи, ул. Центральная,10	122580607601000064	0,1400		16 637 800	3 300 000	8 849 372	ограничений в использовании земель нет
3	Жабинковский с/с, аг. Большие Яковчицы, ул. Центральная, 75	122580601101000139	0,2437		22 001 850	4 400 000	8 356 966	0,0055 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт, 0,0120 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения
4	Жабинковский с/с, аг. Большие Яковчицы, ул. Центральная, 74	122580601101000138	0,2500		22 570 600	4 500 000	8 849 551	ограничений в использовании земель нет
5	Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Жасминовая, 7	122580603601000251	0,1665		51 941 200	10 300 000	10 548 616	0,0055 га – охранная зона электропередачи напряжением до 1000 вольт, 0,1665 га – водоохранная зона реки Мухавец
6	Жабинковский с/с, д. Здитово, ул. Жасминовая, 8	122580603601000252	0,1612		50 287 800	10 000 000	9 658 196	0,1612 га – водоохранная зона реки Мухавец
7*	Ракитницкий с/с, д. Стриганец, ул. Вишневая, 8А	122582403601000210	0,2437		29 358 500	5 800 000	10 949 861	0,0120 га – охранная зона линий связи и радиофикации, 0,0125 га – охранная зона мелиорированных земель
8*	Ракитницкий с/с, д. Стриганец, ул. Вишневая, 8Б	122582403601000211	0,2380		28 671 800	5 700 000	10 949 861	0,0115 га – охранная зона линий связи и радиофикации, 0,0127 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, 0,0505 га – охранная зона мелиорированных земель
9	Ракитницкий с/с, д. Замошаны, ул. Тихая, 9	122582402101000081	0,1554		16 518 500	3 300 000	9 562 238	ограничений в использовании земель нет
10	Ракитницкий с/с, д. Задерть, ул. Центральная, 33	122582401601000068	0,1581		13 974 816	2 700 000	9 286 500	ограничений в использовании земель нет
11	Ракитницкий с/с, д. Федьковичи, ул. Малиновая, 3	122582404601000226	0,1811		15 167 000	3 000 000	9 382 005	ограничений в использовании земель нет
12	г. Жабинка, ул. Приозерная, 8	122550100001002611	0,1265		140 247 700	28 000 000	5 633 326	0,1265 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный
13	г. Жабинка, ул. Приозерная, 6	122550100001002610	0,1262		139 915 100	27 900 000	5 636 767	0,1262 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный
14	г. Жабинка, ул. Приозерная, 4	122550100001002609	0,1303		144 460 700	28 800 000	5 636 767	0,1303 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный
15	г. Жабинка, пер. Приозерный, 11	122550100001002616	0,1177		130 491 400	26 000 000	6 036 943	0,1177 га – водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный

Дополнительное условие:

по лоту №7 возмещение убытков в сумме 735 000 рублей, связанных с нарушением функционирования мелиоративных сооружений, и до начала строительства вынос существующего кабеля;

по лоту №8 возмещение убытков в сумме 2 969 400 рублей, связанных с нарушением функционирования мелиоративных сооружений, и до начала строительства вынос существующего кабеля.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

